Трагедыя сям'і Хомкаў ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Гагатуха ў Плёсках ☞ I

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 1 (2643) Год LII Беласток, 7 студзеня 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

КАЛЯДКІ БЕЛАРУСАЎ БЕЛЬШЧЫНЫ

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Калектыў „Жэмэрва" вельмі ўдала запрэзентаваў даўнія калядкі (справа кіраўнік Анна Фіёнік, Альжбета Баляно, Марта Каліноўская, Паўліна Глінка і Альжбета Фіёнік). На экране відаць Лідзію Бурылу і Надзею Мазурук.

У рамках праекта „Песні, танцы і абрады беларусаў Бельшчыны" Музей малой айчыны ў Студзіводах 21 снежня 2006 г. наладзіў калядную вечарыну ў Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім, які выступіў суарганізатарам мерапрыемства. Старэйшы склад калектыву „Жэмэрва" запрэзентаваў даўнія калядкі і народныя пажадальныя песні, якія спяваліся маладажонам, нованароджанаму дзіцяці ці падросткам. Сабраныя на вялікім экране паглядзелі відэазапіс выступленняў вясковых жанчын і мелі магчымасць параўнаць іх спеў з выкананнем калядак маладым калектывам. Кіраўнік музея Дарафей Фіёнік у ходзе мерапрыемства расказваў пра багаслоўскія вартасці даўніх калядак і народныя матывы ў пажадальных калядках і навагодніх шчадроўках, вытокі якіх можна шукаць у далёкім мінулым нашых зямель.

— Магчыма, што спяваныя „Жэмэрвой" калядкі ўзніклі нават у XVII ці XVIII стагоддзях. У іх глыбокі багаслоўскі змест і ёсць тэксты ўзятыя з багаслужбаў. Можа таму, што запісваліся яны на старажытнацаркоўнаславянскай мове, зараз менш зразумелыя. Цяпер штораз часцей можна ў нас сустрэць меладычныя калядкі на ўкраінскай мове, запісы якіх прывозяцца з-за мяжы, — сказаў Дарафей Фіёнік. — Нашы калядкі былі запісаны ў Крыўцы, а іх тэксты ўзяты з рукапіснага багагласніка Цімафея Садоўскага з Тыневічвялікіх, які перапісваў творы з кніжак і запісваў з вусных пераказаў.

Большасць прэзентаваных на спатканні пажадальных калядак запісаны былі на Бельшчыне. Публіка магла пачуць некаторыя народныя творы спачатку ў выкананні Лідзіі Бурылы і Надзеі Мазурук з Градалёў (і пабачыць выканаўцаў на вялікім экране), а пасля з вуснаў спевакоў „Жэмэрвы". Давала гэта магчымасць пераканацца ў аўтэнтычнасці калядак, якія прагучалі ў белліцэі і параўнаць умеласці вясковых спевакоў і маладых членаў музейнага калектыву. „Жэмэрва" паказалася тут вельмі прыстойна.

— У рэпертуары „Жэмэрвы" толькі аўтэнтычныя народныя песні, якія спяваліся ў мінулым у нашых вёсках. У прэзентаваных сёння пажадальных калядках ёсць вельмі старыя тэксты і архаічныя мелодыі. Паказваюць яны культуру нашых продкаў, іх мову і філасофію жыцця, — заявіла Аня Фіёнік, кіраўнік калектыву.

— У вёсках людзі добра ведалі пра ўсе важнейшыя здарэнні. Не ішлі з калядкамі ў хаты, дзе была жалоба па памерлых. У іншых дамах апрача традыцыйных калядак спявалі пажадальныя калядкі для маладажонаў, нованароджанага дзіцяці ці маленькіх хлапчукоў і дзяўчатак (асобныя калядкі) у дашкольным узросце, — тлумачыў Дарафей Фіёнік.

Змест пажадальных калядак, якія спяваліся ў аддаленых ад сябе вёсках (найбольш песень было з Градалёў і Плёсак) розніўся, але іх ідэя і матывы былі сходнымі. Спяваючы нованароджанаму дзіцяці („Там по прызбоньці" — Плёскі, „Там по пэрыні" — Градалі) каляднікі ўспаміналі бацьку, які быў далёка па-за домам (займаўся паляваннем або карчаваў лес) і чакаў звестку ад жонкі.

— У нашай традыцыі было прынята, што бацька не можа быць у хаце ў час родаў і таму ў калядках бацькі нованароджаных дзяцей знаходзіліся далёка ад сваіх вёсак, — гаварыў Дарафей Фіёнік. — Цяперашнія прапановы, каб жонка радзіла дзіцё ў прысутнасці мужа, не супадаюць з выпрацаванымі ад вякоў правіламі.

Каляднікі дэкларавалі маці дапамогу ў час апекі над дзіцём і непрысутнасці мужа. У калядках спяваных маладажонам („Ой ясна, красна ў лузе каліна" і іншых) паўтараліся пахвальныя словы ў адрас жонкі і мужа, якія пасля больш шчодра, чым іншыя жыхары сяла, узнагароджвалі каляднікаў грашыма або святочнымі прысмакамі. У народных калядках часта паяўляліся даўгавечныя дрэвы ціс і явар, пад якімі адпачывалі людзі.

— Ёлка, якая прыйшла да нас з Нямеччыны, не трапіла на пусты грунт. Менавіта ціс і явар былі тымі моцнымі і даўгавечнымі дрэвамі, якімі захапляліся нашы продкі. Пасля замясціла іх вечназялёнае дрэва — елка, — расказваў Дарафей Фіёнік, звяртаючы ўвагу на павукі, якімі ўпрыгожваліся хаты перад прыходам моды на ёлкі.

Апошнімі творамі, прэзентаванымі ў белліцэі, былі навагоднія калядкі — шчадроўкі. Адна з іх выконвалася на падставе запісу зробленага на Палессі, з якім актыўна супрацоўнічае Студзіводскі музей.

Мерапрыемства завяршылася пачастункам. У Студзіводскім музеі былі падрыхтаваны посныя стравы — аладкі, піражкі і варэнікі, якія вельмі смакавалі сабраным.

— У рамках нашага праекта сабралі мы многа народных песень і яшчэ ў студзені прадбачваем выдаць зборнік „Песні Бельшчыны. Гміна Орля" пад рэдакцыяй Сцяпана Копы. У Крыўцы будзе таксама наладжаны майстар-клас для малодшага і старэйшага складаў калектыву „Жэмэрва", — дабавіў Дарафей Фіёнік. — Нашу задуму ўдалося рэалізаваць дзякуючы фінансавай дапамозе Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі і горада Бельск-Падляшскі.

Аляксей МАРОЗ

Рэдакцыя

Без ажыятажу ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

У старадаўнім Гродне, як і па ўсёй Беларусі кампанія па „выбарах у мясцовыя саветы" выйшла на свой фінішны адрэзак. Ідзе апошні этап перадвыбарчай гонкі — агітацыя, хоць знешне гэта аніяк не праяўляецца...

Цёплых сноў ☞ 2

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Прысніўся мне нядаўна сон. У суб'ектыўным плане гэтая з'ява наведвае мяне рэдка і да таго ж даўгавечнасцю яна нагадвае метэоры ці нават мезоны. Але пакуль мігценне ад апошняга, у момант пісання гэтых радкоў, яшчэ не патухла, аглянуся я на хвіліну за ім...

Найпрыгажэйшая — душа ☞ 8

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

„Ніва": — Сёння лёгка быць мастаком у Беларусі?

Зоя Луцэвіч: — Мне не хочацца нават думаць аб сітуацыі ў Беларусі ў гэтым аспекце. Наогул у свеце мастакам сёння жывецца цяжка. У сувязі з эканамічнымі зменамі ў свеце людзі перасталі выдаваць грошы на мастацтва...

Чатырох мушкецёраў ☞ 9

Басаўка

Быць карысным, салідарным, стаць басаўцам і не забываць пра старэйшых сяброў — такога зместу прысягу давалі сёлета першакурснікі беларускай філалогіі на атрасінах у Супраслі. Ага, яшчэ павышаць узровень атрасінаў і прынамсі раз у год наведаць дачу Алега Латышонка. Можа не да канца так гучалі словы прысягі, але, вядома, самы важны сэнс ды мэта, а неабавязкова дарога да яе... Шлях да атрасінаў, аднак, вельмі прыемны, не наракалі і тыя, што на сваіх машынах ехалі, але і тыя, што з аўтобуса ці з падсадкі ішлі пару кіламетраў, нібыта ў студэнцкую Мекку...

9 770546 196000

Без ажыятажу

У старадаўнім Гродне, як і па ўсёй Беларусі кампанія па „выбарах у мясцовыя саветы" выйшла на свой фінішны адрэзак. Ідзе апошні этап перадвыбарчай гонкі — агітацыя, хоць знешне гэта аніяк не праяўляецца. Горад, у адрозненні ад аналагічных выбараў у якой-небудзь іншай еўрапейскай краіне, не заклеены вялізнымі партрэтамі прэтэндэнтаў на пасаду дэпутата гарадскога або абласнога савета. Не кідаюцца ў вочы ні каляровыя шыльды з кароткімі лозунгамі, ні інфармацыйныя ўлёткі з праграмамі будучых „народных абраннікаў". Калі нешта і нагадвае выбаршчыку пра неабходнасць выканаць свой грамадзянскі абавязак, то толькі сціплыя інфармацыйныя плакаты ў чырвона-зялёных колерах, на якіх паведамляецца пра тое, што 14 студзеня 2007 года выбары ўсё ж будуць праведзены.

Брак перадвыбарчага ажыятажу невыпадковы. На большасці акругаў Гродзеншчыны балатуецца толькі адзін кандыдат. Так што гэты працэс выбарамі можна назваць даволі ўмоўна, бо выбіраць, па сутнасці, няма з каго. Выбаршчыку застаецца прыйсці на выбарчы ўчастак і кінуць у скрынку для галасавання бюлетэнь толькі з адным прозвішчам. Такі стан рэчаў задавальняе ўладу, якая перад выбарамі ўвяла ў выбарчы кодэкс змены. Паводле тых зменаў выбары, нават каб кандыдатаў было шмат, усё адно мусілі б прайсці за адзін тур. Выйграе той, хто набярэ больш галасоў, нават калі не набярэ іх і палову ад агульнай колькасці выбаршчыкаў. Другога туру, як гэта было раней, не будзе.

Апазіцыйныя палітычныя партыі, якія ўваходзяць у кааліцыю аб'яднаных дэмакратычных сіл, на першым выбарчым этапе, калі рэгістраваліся ініцыятыўныя групы, закрылі практычна ўсе акругі Гродна. Наконт некаторых, найбольш перспектыўных раёнаў горада, нават вяліся спрэчкі. Гэта рабілася дзеля таго, каб ад апазіцыі не выставіць на адну акругу больш аднаго кандыдата і каб максімальна перакрыць усе кварталы горада.

Але апазіцыянеры ад самога пачатку не разглядалі гэтыя выбары як мажлівасць супольнай ці асабістай палітычнай перамогі. Перш за ўсё таму, што прадстаўнічая ўлада на Беларусі не мае больш-менш важкіх мажлівасцей, каб істотна ўплываць на сітуацыю ў краіне, або ў канкрэтным рэгіёне. Рэальныя мажлівасці застаюцца ў руках выканаўчай улады ці, як яе цяпер называюць, у прэзідэнцкай вертыкалі.

Таму на пачатку ў колах гродзенскай апазіцыі нават вяліся дыскусіі ці ісці ўвогуле на гэтыя выбары, ці лепш схіліцца да іх байкоту. Урэшце перамагла думка, што ісці трэба. У першую чаргу для таго, каб мець легальную мажлівасць працаваць з насельніцтвам. Таксама агучваліся мэты паказаць выбаршчыкам і ўладзе, што апазіцыя існуе і мае моц, давесці да насельніцтва свае погляды і патрапіць кандыдатам на кангрэс аб'яднаных дэмакратычных сілаў, які мае адбыцца ўвесну 2007 года. Для таго, каб туды патрапіць, кожны, хто зарэгістраваў сваю ініцыятыўную групу, мусіў набраць не менш за 300 подпісаў выбаршчыкаў на сваёй акрузе. А перспектыву выйграць выбары апазіцыянеры ад пачатку разглядалі проста як дадатковы прыз. Таму ахвотных зарэгістраваць свае ініцыятыўныя групы было больш, чым тых, хто збіраўся ісці да канца кампаніі.

Але зараз засталіся зарэгістраванымі ў кандыдаты толькі каля дзесяці незалежных кандыдатаў. Астатніх папросту па розных надуманых прычынах не зарэгістравалі, некаторыя ж самі не пажадалі прымаць удзел у далейшых этапах такіх выбараў.

Што тычыцца звычайных грамадзян, то яны заняты зусім іншымі праблемамі. Рыхтуюцца да калядных і навагодніх святаў, якія на Беларусі заўсёды святкуюць як адны з найвялікшых. І ім не да выбарчых клопатаў. Можа таму ўлада і прызначыла выбары ў мясцовыя саветы акурат на стары Новы год, які праваслаўныя хрысціяне, якіх большасць на Беларусі, шануюць і стараюцца святкаваць у сямейным коле, не заўважаючы сабе галаву ніякімі выбарчымі турботамі.

Віктар САЗОНАЎ

Цёплых сноў

Прысніўся мне нядаўна сон. У суб'ектыўным плане гэтая з'ява наведвае мяне рэдка і да таго ж даўгавечнасцю яна нагадвае метэоры ці нават мезоны. Але пакуль мігценне ад апошняга, у момант пісання гэтых радкоў, яшчэ не патухла, аглянуся я на хвіліну за ім.

А было ў сне так: выбіраўся я з нейкай знаёмай мне хаты ў нейкую дарогу. Да ад'езду аўтобуса з недалёкага ад хаты прыпынку аставаліся дзве-тры мінуты. У той час на сонным плане з'явіліся мае знаёмыя, якія ў рэальнасці час ад часу заходзяць да мяне на чаёк. І ў сне таксама здарыўся чай, а дакладней яго нарыхтоўка. І зараз спешка на аўтобус з прыгадваннем, ці чаго не забыў. Мае госці (гаспадары?) падбадзёрылі мяне і я ўжо чакаю рэйсавага аўтобуса. І чакаю я яго ўжо ў зусім новым месцы, якое мне падалося быць у Маліннiках, за паваротам у напрамку Кляшчэль. Неўзабаве пад'ехала маршрутка, сеў я і еду. Хачу ў Варшаву і шафёр запатрабаваў з мяне мнагавата грошай, бадай сто злотаў; калі я заглянуў у кішэню, у мяне было іх дакладна столькі. А пасля што рабіць з парожнімі кішэнямі, як будзе вярнуцца з тае Варшавы? — занепакоіўся я. Адмаўляюся тады ад далейшай такой язды і шафёр пагардліва высаджвае мяне ў глыбінцы Мазовіі, пад высокай горкай. Навокал вясковыя забудаванні і не відаць ніякага арыенціра (горка ўжо прапала), які б мне дазволіў выбраць ход далейшых падзей. Не відаць нідзе нават касцельнай вежы, па якой бы можна было ўстанавіць прыблізныя каардынаты. Іду наўздагад у напрамку, у якім мне здаецца быць Беласток. Побач маёй дарогі нейкая іншая паралельная дарога і невядома, ці не трэба ісці па той другой. І чужына тут страшэнная, не толькі чужы ландшафт, але і чужыя людзі. Усё ж такі заходжу на адзін панадворак, у дом, які цяпер можна было б назваць тэатральным атэльле, дзе на розных узроўнях некалькі памостаў, паміж якімі няма сцен. У доме бадай адны жанчыны, апранутыя ў чорнае, як у міжземнаморскіх вёсках, да таго ж маўкліва скаваныя нейкім невядомым мне рытуалам. Але раптам адна з іх жвавее і — неспадзявана — на беларускай літаратурнай мове тлумачыць мне дарогу ў напрамку адлеглай за пяць кіламетраў мясцовасці, з якой я буду мог выбрацца ў Беласток. І я зноў выходжу на дарогу, паралельна з якой зноў нейкая іншая, і я зноў не ведаю, якую з іх мне трэба выбраць. Распытваю сустрэтага мужчыну, а ён мне тлумачыць ісці ў зусім адваротным напрамку да таго, у які кіравала мяне нядаўная дабрадзейка. Чарговы ўдар дэзарыентаванасці выбівае мяне са сну...

Сон не з вясёлых, трывожны. І выпадала б у гэтым месцы сур'ёзна занепакоіцца будучынёй, бо ж сны ў нашым бытавым талкаванні найчасцей прывязваем да будучыні; калі каму здарыцца нешта сумнае, тады людзі прыгадваюць, што некаму сніўся нейкі трывожны сон. І такім чынам сон прымае ролю вестуна, а людзі гадаюць па іх пра далейшыя падзеі.

Аднак у сне, думаю што не толькі ў прыведзеным маім, бачым з'явы, якія ўжо здарыліся, бачым абразы, якія ўжо недзе раней бачылі. Бо ж і я, для прыкладу, і падарожнічаю, і таргуюся за цану, і гляджу дакументальныя фільмы з Арыента, і з акна поезда бачу мазавецкія вёскі. Дык вось у неспакойным сне мае біятокі закруціліся туды-сюды па знаёмых нейронавых дарожках, сям-там збіваючыся з тых дарожак, і паказалі мне вычварны спектакль быццам з маім удзелам.

І калі так тлумачыць, значыць трэба было б адмовіць прадвяшчальнай вымове сноў. Але адмаўляць не выпадае, бо сны сапраўды прадвяшчальныя. Эпізоды з мінулага паўтараюцца не толькі ў снах. Праўда, эпізод эпізоду не раўня: адны з іх паўтараюцца часцей, іншыя спарадычна, а ёсць і такія, якім паўтору не бываць; на цяперашняй кансумпцыйнай мове апошнія можна назваць эпізодамі аднаразовага ўжытку. І вось сон прыгадаў мне, што зноў наведае мяне нейкае здарэнне, пра якое пакуль талкаваць зарана. Але калі яно ўжо мне звяліцца на галаву, тады вось і настане час прыгадаць: а вось жа быў такі сон прысніўся...

Маем цяпер навагодні перыяд, перад намі чарговы адрэзак часу, з якім большасць людзей звязвае нейкія спадзяванні. І нямала людзей, якія б ахвотна пагадалі, паваражылі: а што гэта ў чарговым годзе здарыцца? Вельмі хацелася б, каб здараліся такія здарэнні, якія выклікалі б успаміны цёпленькіх сноў. Калі пішу гэтыя словы, наша зіма яшчэ цёплая. І хацелася б, каб яна навейвала гурбы цёпленькіх сноў.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Газавы ватажка

Польшча, а пэўна ж і немалая частка рэшты Заходняй Еўропы, жыла ў апошні час у напрузе. Вось Масква пастрашыла Мінск павышэннем цэн на газ і, як даносілі з колаў блізкіх Крамлю, іх спыненнем. Напруга была амаль роўная той, якая спадарожнічала гледачам „Біг Брадэра", калі гэта Вялікі Брат вырашаў, каго з удзельнікаў гэтага рэаліці-шоў у тэлебачанні пакараць, а каму віны самім сабой названыя даравацъ. У беларуска-расійскм выпадку справа была ўсё ж больш істотная, чым гэтыя са спектакля ў тэлебачанні. Спрэчка працягвалася (а можа працягваецца і цяпер, калі чытаеце гэты тэкст) за кантроль над беларускім адрэзкам ямальскага газаправода. Якраз гэтым шляхам газ з Расіі трапляе ў Польшчу ды далей — хоць бы ў Нямеччыну. Расійскі Газпрам, пастаўшчык сыравіны, мае «пэхо» на суполку Белтрансгаз; хацеў бы пераняць у ёй паі. Калі не, дык Масква намерваецца ў тры разы павялічыць цэны за кубаметр газу, значыць, аж да 200 долараў.

Аляксандр Лукашэнка спрабаваў пастрашыць заходніх еўрапейцаў, што завінціць ім кран на сваім газавым адрэзку. Цяжка тут не пагадзіцца з правай французскай газетай „Le Figaro", якая напісала, што Аляксандр Лукашэнка рашыўся гульнуць на газавым канфлікце з Масквой картай „страху ў Еўропе".

Нявыключана, што гэтая гульня была магчымая пры ціхім дазволе Крамля. Прыгадвае гэта, дарэчы, гульні з часу халоднай вайны. Рацыя, аднак, на баку Тамаша Філя, прэс-інфарматара Польскай горнапрамысловасці нафты і газу. Заявіў ён халаднакроўна:

— Для атрымальнікаў расійскага газу ў Польшчы ёсць важным, што частку гэтай сыравіны імпартуем праз Украіну. Справа ў 2,8 мільярдах кубаметраў з 6,5 млрд., якія купляем у Расіі. Дадаткова адну траціну нашага забеспячэння пакрывае краёвая дабыча. Апрача гэтага, у выпадку непаладак з пастаўкамі газу праз Беларусь у Польшчу можам пакарыстацца рэзервамі. У газасховішчах накапілі мы амаль мільярд кубаметраў гэтай сыравіны.

Падобна думае міністр гаспадаркі Пётр Возьняк:

— З кантрактамі мы спраўляемся бездакорна. Нашы плацяжы тэрміновыя і поўныя. Не прымаем пад увагу любых непаладак у пастаўках.

Польшча ўжо двойчы ў апошнія гады адчула вынікі газавай вонкавай палітыкі Газпрама. Першы раз у 2004 г., калі Расія спыніла пастаўкі ў Беларусь. Другі раз, калі спыніла іх ва Украіну, якая не магла пагадзіцца з планамі павышэння цэн у пяць разоў. Згаданая французская газета прыпамінае, так як і прэс-інфарматар ПГНіГ, што Газпрам накапіў сур'ёзныя рэсурсы сыравіны ў Нямеччыне, Прыбалтыцы, а і Польшча, аб чым успамінае „Le Figaro", мае свой запас.

Пуганне Еўропы пры нагодзе гэтай напругі (учыненай на лініі Масква — Мінск?) Аляксандрам Лукашэнкам толькі даказвае свету і не першы раз — што кіраўнік Беларусі стараецца паказаць яму, што адыгрывае ў свеце сур'ёзную ролю, што трэба з ім лічыцца, а папраўдзе з'яўляецца звычайным ватажкам, калі б не сказаць авантурыстам. Толькі як доўга яшчэ будзе з такім правадыром лічыцца Крэмль. Лідэр аб'яднанай беларускай апазіцыі сцвярджае, што не больш чым два гады. Гучыць гэта ледзь не як навагодняя варажба:

— Цяпершнія ўлады страцілі нават найвышэйшых прыхільнікаў. Ужо мала хто верыць, што яны чагосьці яшчэ вартыя.

Прытым, спасылаючыся на канфлікт з Газпрамам, адзначыў, што расіяне не хочуць правалу беларускай гаспадаркі, паколькі Беларусь — важная транзітная краіна, ды будуць патрабаваць, колькі ўдасца.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Як пяцёх братоў Хомкаў забілі

Ідзем з Аняй Любэцкай па дарозе ў Студзянкі. Гэта, ехаўшы на Васількаў, надалёка за Беластокам, управа. Вёска, дзе жыве яе бабуля Ліда з роду Хомкаў з мужам сваім Юзафам, праваслаўныя. Што тут праваслаўныя жывуць, пазнаць можна па крыжы, што стаіць побач каталіцкага на скрыжаванні перад вёскай. На крыжы напісана: „Госпадзе, сахрані нас ад усякага зла: землятрусу, патопу, агню, мяча, між намі нянавісці і спасі Сваёю благадаццю".

Бабуля Ліда ў „Ніву" са сваёй крыўдай прыйшла ўжо гадоў сорак таму. Усенька расказаць хацела, паказаць дакументы, здымкі. Бо такое гора спаткала яе як не адну тутэйшую жанчыну, сястру, дачку. Ды рэдактар сказаў: „Час яшчэ не той. Хочаш жыць? То пакінь пакуль". А калі той час сказаць праўду?

Здымкі цяпер пераглядаем: дзеці Лідзіны: Генё — 1948 года нараджэння, Леаніла — 1946. Усе раз'ехаліся, пайшлі ў розныя веры.

— А ці хто тут жыве, — пытаецца другая ўнучка Ліды, Ева Саковіч, — з тых, хто забіваў тваіх, бабцю, братоў?

— Не, ні аднаго няма ў жывых. А ад чаго ўсё тое пайшло? Ад таго, што мы — праваслаўныя. — Бабуля паказвае кнігу, дзе на старонцы сотай пазначаны імёны яе пяцёх братоў, якіх пералавілі ў розных мясцовасцях Беласточчыны і забілі чатырох 17-га мая 1945 года — Костуся (1924 года нараджэння), Янку (1913), Пятра (1911), Вінцука (1909) ды 3 жніўня Аляксандра (1908), пасля росшукаў — аж у Дамброўках. Тут Ліда пры па-польску напісаных імёнах і прозвішчах дрыжачай рукой напісала была іх імёны ды прозвішча па-свойму... А жылі яны ў лясной вёсцы Панурае. Тры кіламетры ад Студзянак.

— Доўга жылі тыя бандыты, ды ўжо таксама паўміралі. Ні аднаго няма. Хто быў сярод іх? Хоць бы Малахоўскі. Ды пасля ўразумнеў. Хто ж падумаў бы. Я ўсіх імёны і прозвішчы магу падаць. Я да мамы ўсё бегала ў Панурае. Мой брат гнаў самагонку. Я забегла ў аўторак. А мой брат сядзіць, кажа: а ты ведаеш, што мне сёння прыснілася? Вялікі дол, я ў гэтым доле, і не мог выбрацца. Кажу: штосьці страшнае будзе. Я з'ела кавалачак хлеба з саланінай, што мне мама далі, узяла гарэлку на продаж. Брат выйшаў. Я пасядзела яшчэ хвілінку з мамай. І чуем стрэлы. І не падумалі, што па ім страляюць! Я выскачыла на падворак, а тыя бандыты — за мною! Сястра ў той час пабегла на чыгунку. Яны сталі шукаць і маю сястру. Увечары прыходзіць да мяне татка, стукае ў акно. Усіх пабралі, няма!

Аднаго брата замардавалі пад Супраслю, іншых недалёка ад Панурага. Пятага — Олеся — у Дамброўках...

— Не пайшла я адразу на іх магілу. Прыходжу, а тыя зрабілі вялікую скрыню, трох братоў кладуць у яе. А бандыты гавораць паміж сабою: у Васількаве яшчэ адзін жыве. А ты чаго сюды прыйшла? А што, мяшаю вам? То чаму не прыйдзеш на іх паглядзець, хадзі, пабачыш, чаго яны вартыя. А што, можа і мяне хочаце забіць? Калі ласка! Я стаю з нажом у кішэні. Кажа той Уладак на таго Югана: Ідзем адгэтуль, бо невядома што яшчэ станецца. І на мяне глядзяць. „Będziesz płakać, to my ciebie zastrzelim!" І забраліся. А я не магла ўвайсці ў тую стадолу, дзе мае браты ляжалі. Вярнулася ў Студзянкі.

Уся сям'я ў Панурым

Пятро Хомка

На другі дзень раніцай пайшла я сюдою, каля Свентэй Воды, села на шашу, гляджу: вязуць канём скрыню. Я адкрыла труну. І ўбачыла штосьці страшнае. Мае браты былі проста ў кавалках, пасечаныя. Месца жывога не было. Ад усяго таго нават і не помню, як я была на могільніку.

А пятага, Аляксандра, у Дамброўках злавілі. Забралі яму боты, адзенне, прывязалі да пары коней і гналі аж пад Гараднянку. Аж на наша ўрочышча *Запашкі*. Ужо нежывога, бо дзе ж Дамброўкі, а дзе тут. Там яго і закапалі. Адна жанчына падказала дзе. Так быў расшарпаны, да непазнакі. Нават па ботах немагчыма яго было пазнаць, бо новыя з яго здзерлі, нацягнулі якіясь чобаты. Я не ведала, як гэта ўсё перажыла.

Ліда з Юзафам і дзяцьмі

Не ўсіх тут у гэтай кнізе, што прапалі за нішто, бо не ўсе ж змагаліся за „народную ўладу", памясцілі. Прыехаў быў адзін хлопец у Студзянкі ў водпуск. З арміі, паручнік. Калі б я ведала, што ён прыехаў, я б яго ж асцерагла. У Ажыннік ехаў Буцько. І кулаком мне пагаражае, каб я нікому не сказала. І а як жа, ехаў яго забіць. Сорак пяты год! Мая Зосенька памерла ў годзік. І свёкар памёр, у той час, як Аляксандра забілі. Столькі мела я перажыванняў! Як гэта пісаць?! І за што іх пабілі?! Што яны ім зрабілі?

Ян Хомка

Забралі былі нам каня. Пайшла я ў Ажыннік, каб яго нам аддалі. Выйшлі тыя бандыты. Мела братоў? Мела. І кабылкі таксама не будзеш меці, не аддамо. Ды звярнулі, там адзін чалавек людскі быў. І прыязджае Руткоўскі, Эдэк. Такі мой сусед з Ажынніка. Мой калісьні нарачоны. Аказалася, што ён, калі мардавалі маіх братоў, разам з імі быў. Я пайшла да суседкі і чую як ён расказвае суседу аб тым, як мардавалі. Казалі былі Янку: *Przeżegnaj się, skurwysynie!* Не азываўся да іх, адно жагнаўся. А Костусь: „Не буду жагнацца, бо Бога на свеце няма! Няма ніякай праўды!" Сусед сказаў таму Эдзю, што я ведаю пра тое, што ён там быў. Я пасля яго наведала. Дык ён спалохаўся: Ты што, прыйшла адпомсціць на маіх дзецях? Не, кажу, ды дай ім Бог дачакаць таго, што мае браты з тваёй дапамогай.

Кастусь Хомка першы злева

Мы яшчэ былі з Ёзікам маладыя. Пайшлі мы на забаву. Эдзік таксама быў. Сказаў Ёзіку: Слухай, я хачу ўзяць тваю, патанцаваць з ёю. Мушу ёй да чагосьці прызнацца. А быў ужо вельмі хворы. І я пайшла. Кажа: Даруй мне за ўсё. Гэта была мая работа. Калі б я ім сказаў, што гэта няпраўда, што не разбівалі яны ніякай Польшчы, што гэта добрыя людзі, мае калегі, дык іх не пабілі б. Так, ты мне гэта цяпер кажаш. А чаму ты гэта зрабіў? Чаму? А калі Эдзік уміраў, прасіў, каб я прыйшла з браціхай да яго, ды мы не пайшлі.

А я нават плакаць не змагла. Такая трагедыя. А ў Васількаве ў адной сям'і адразу васьмярых забілі. Клікалі мяне суседзі, каб я пайшла на іх веру, то мне будзе бяспечней у такі час. І ксёндз клікаў. Шкадаваў мяне. Добры чалавек той ксёндз быў.

Хто біў і за што?

— Мае браты да нічога не належалі. А тыя, хто іх забіў? „Рух апору". Звычайныя бандыты. Я таго, што ўбачыла тады на возе, „Завею", Буцьку, ужо пасля і не бачыла. Мільгае ў памяці момант, як прыйшлі былі АКаўцы, а я з адной дзяўчынай, Лідай Вільчэўскай, само вешала фіранкі. А ну, памагайце чысціць карабіны! А мы ходу з хаты! Якія гэта былі жаўнеры! Жывадзёры, сцягвалі боты з людзей! Мы мусілі перажыць усё гэта, іншай рады не было.

А за што іх пабілі? Нашы хлопцы Польшчы служылі. Янка быў да вайны ў арміі ў Аўгустове, ва ўланах крэхавецкіх. Пётр на вайне быў. Костусю не было яшчэ 18 гадоў. Найстарэйшы быў гаёвым. У партызанцы, польска-савецкай, адно я была. А хто біў... Іваніцкі, Руткоўскі... „Завея"-Буцько...

Дзе я была ў партызанцы? У нашых лясах, каля Панурага. Пазначаны былі партызанскія трыбы пасля, расказвалі пра наша змаганне. Я мела псеўданім „Паплаўская Рэгіна". Цяпер мне „камбатанцкае" даюць. І дзяўчынку жыдоўскую мы хавалі ў сябе, як сястрычку, пасля з'ехала ў Калінінград, цяпер яна Сучкова Дуня. Чамусьці змоўкла — можа, памерла?..

Дзе той хутар Панурае ёсць? На старых картах пазначаны. Пасля хтосьці падпаліў гаспадарку Хомкаў. І няма ні дома, ні хлявоў. Зусім нядаўна! Як страляла ружжо, сабранае на гарышчы! Цяпер на новых картах не знойдзеш Панурага.

Адно з дзяцей Ліды — католік, трымаецца (начальнікам) пры апошняй дзяржаўнай уладзе, называе сябе праваслаўным палякам. З гонарам паказвае адзнакі свайго дзеда за адбудову Супрасльскага храма. Таксама мае дома кнігу пра тых, хто згінуў з ягонымі дзядзькамі ў пасляваенную вайну.

Міра ЛУКША

Фота з архіва сям'і Хомкаў

Як уціхамірыць хуліганнё

У адзін лістападаўскі вечар у драўлянай, прыгожа памаляванай пачакальні на аўтобусным прыпынку ПКС у Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна) хуліганы разбілі сценку і вырвалі з яе аконную раму. Наламалі дошчачак, дасталі з кошыка паперу і расклалі агонь. Жыхар Ляўкова папрасіў паліцыю ў Гайнаўцы, каб яна ўсціхамірыла хуліганнё. Нічога не атрымалася.

У чацвер, 14 снежня, ляўковец, які жыве ў доме побач пачакальні, прыбіў аконную раму на сваё месца. Радны з Новага Ляўкова патэлефанаваў у Гмінную ўстанову ў Нараўцы, каб добраўпарадкавалі пачакальню, прыбралі смецце. На наступны дзень люба было паглядзець, як можа быць чыста і прытульна ў пачакальні.

І прыйшла нядзеля, 17 снежня. А 16 гадзіне ўжо сцямнела. У гэтую пару з Ляўкова ад'язджае аўтобус ПКС у Беласток. Прыйшлі юнакі-пасажыры, сярод іх, пэўна, былі таксама вучні. Дзяўчат не было. Іх праводзілі б у дарогу маці, сястрычкі або сяброўкі. А так дык былі самі хлопцы. Яны сарвалі з дошкі аб'яў афішы і абвесткі Гміннай рады ў Нараўцы, падпалілі ды кінулі пад ногі. Аб тратуарную плітку разбілі бутэльку з-пад віна. Неўзабаве прыехаў аўтобус і хуліганнё паехала. На тратуары тлелі паперы ў парывах ветру. Прыкра было глядзець на забруджаны і засмечаны тратуар, на абдзёртую дошку аб'яў. Вось такія сумныя факты. Мабыць, вяскоўцам прыйдзецца дзяжурыць у той час, калі прыязджаюць і ад'язджаюць міжгароднія аўтобусы.

У Гайнаўцы

Мінулы год добра запамятаецца многім жыхарам Гайнаўкі. Улады Гайнаўкі рэалізавалі шматлікія інвестыцыі, у тым ліку мадэрнізавалі паверхні гарадскіх вуліц.

Закончылі пабудову новай асфальтавай 1,5-кіламетравай вуліцы Ракавецкага на ўскраіне горада. Яна спалучыла вул. Арміі Краёвай з вуліцай Ліпавай і далей з вёскай Ліпіны. Вуліца Ракавецкага атрымала шырокі тратуар з аднаго боку і спецыяльную дарожку для веласіпедыстаў ды вулічнае электраасвятленне.

Ужо гатовы другі этап будовы вуліцы Баторыя. Тут пабудавалі дажджавую каналізацыю, мост на рачулцы Лясной і святлафоры на скрыжаванні вуліц Баторыя і Ліпавай.

У розных раёнах горада аднавілі вуліцы, між іншым, паклалі асфальт на вуліцах Падлясе і Спадовай (раён Падлясе), на вул. Кнеўскага, (раён Хімічная фабрыка), на вул. Верабея (цэнтр горада) і на вул. Металёвай (раён Пашкі).

Прыбыло больш тратуараў. Тратуарныя пліты паклалі на вуліцы Электрычнай і Доўгай (раён Пашкі) ды на вул. Арміі Краёвай (цэнтр горада).

(мох)

У Шудзялаўскай гміне

Шудзялава, гэта гмінная мясцовасць па дарозе між Саколкай і Крынкамі, заснаваная ў 17-м стагоддзі. У вёсцы каталіцкі касцёл Вінцэнта Ферарыя і Варфаламея Апостала, пабудаваны ў 1935-1938 гг. Раней, у 19-м стагоддзі, пры закрытым касцёле была наладжана царква, далучаная ў якасці філіі да прыхода ў Паўночным Востраве. У 1900 годзе быў тут заснаваны самастойны прыход пры новапабудаванай царкве. Пасля першай сусветнай вайны царкву раскідалі і знеслі, прыход быў скасаваны, а вернікі спачатку далучаны да прыхода ў Юраўлянах, а ў 1928 годзе перанесены ў Востраўскі прыход.

Праваслаўным следам

Царква ў Паўночным Востраве існавала ўжо ў 17-м стагоддзі. Згарэла яна ў першую сусветную вайну, а прыход быў падпарадкаваны прыходу ў Юраўлянах. Новую, Успенскую, царкву вернікі пабудавалі ў 1952 годзе. Тым часам, у першай палове 1940-х гадоў, на некалькі гадоў з тэрыторыі прыхода адлучылася філіяльная царква ў Грыбоўшчыне.

У Шудзялаўскай гміне дзейнічае яшчэ Петрапаўлаўская царква ў Самагрудзе каля Бабік. У друкаваных крыніцах гэты прыход згадваецца толькі пад 1713 годам. Захаваліся метрыкальныя кнігі з канца 18-га ст. Метрычныя даныя выводзяцца з другой паловы 19-га ст. і выпісаны з друкаванай крыніцы. У міжваенны перыяд прыход у Самагрудзе быў скасаваны, а царква далучана да Юраўлянскага прыхода. Сучасныя метрыкальны кнігі камплектныя.

Інакш маецца справа ў самім Шудзялаве — там па сённяшні дзень не ўдалося знайсці метрыкальных кніг, якія згодна з пастановамі дзяржаўных улад павінны быць у тамашнім загсе.

Культурныя козыры

Зараз драўляная царква ў Самагрудзе (1867 г.) і царкоўны комплекс у Паўночным Востраве (палова XX ст.) залічваюцца — у ліку іншых — да культурных каштоўнасцей Шудзялаўскай гміны. Іншымі каштоўнасцямі з'яўляюцца:

— прасторавыя планіроўкі вёсак;

— многія вартыя ўвагі аб'екты драўнянага вясковага будаўніцтва, найбольш у Шудзялаве, Вярхлесе, Кнышэвічах, Слоі, Войнаўцах, Гаркавічах і Паўночным Востраве;

— драўняны двор у Пісароўцах (1850 г.);

— касцёл у Шудзялаве (1938 г.);

— драўняныя ветракі ў Хмялеўшчыне, Шчасновічах, Навінцы, Вайноўцах і Мінкоўцах;

— паслядворскія паркі ў Зубоўшчыне, Зубрыцы-Вялікай і Жухаве;

Драўляная царква ў Самагрудзе (1867 г.)

— некаторыя старыя могілкі.

Прыродныя козыры

У Шудзялаўскай гміне вельмі разнастайны і цікавы для турызму ландшафт — бугаркаватая тэрыторыя двух адметных абшараў: Кнышынскай пушчы з кампактнымі лясамі і амаль бязлеснае Сакольскае ўзвышша. Тэрыторыя гміны ад поўдня і захаду ахоплівае частку Ландшафтнага парку Кнышынскай пушчы і ягонага абмежку, а ад усходу і поўначы — фрагмент Абшару ахоўваемага ландшафту Сакольскага ўзвышша. Найбольш цікавыя пушчанскія гушчары, даліна віючайся між лясоў рэчкі Слоі і ўзгоркі вышынёю звыш 200 метраў н.у.м., якія ўтвараюць грады накшталт міні-горных хрыбтоў з многімі назіральнымі пунктамі. У межах гміны ёсць шэсць прыродных запаведнікаў у Кнышынскай пушчы. Іншымі вартымі ўвагі аб'ектамі могуць быць хаткі баброў на пушчанскіх рэчках, некалькі выдатных дрэў — помнікаў прыроды, зборышчы валуноў на Сакольскім узвышшы.

Па Шудзялаўскай гміне праходзяць два пешыя маршруты:

— Вялікі татарскі шлях: ад Новай Свідзялаўкі праз Талькоўшчыну і Вярхлес у Старую Камёнку;

— Па слядах Студзеньскага паўстання 1863 г. ад Валіл-Станцыі праз запаведнік Пясочная гара і Копную Гару ў запаведнік Міжрэчча.

Ёсць яшчэ прыродазнаўчая сцежка ў раёне Копнай Гары.

На будучыню

У рамках апрацаванай канцэпцыі развіцця турызму дзеля прыцягнення вонкавай зацікаўленасці Шудзялаўскай гмінай прадбачваюцца м.інш. наступныя меры: праз гміну пралягуць па два пешыя і веласіпедныя маршруты „Шляхам краіны зубра", плануецца пабудова 2-3 назіральных вышак у наваколлі Войнаўцаў і Слоі і разметку сцежак да іх. Прадбачваецца таксама закладку паказнога рэзервата зуброў; яго лакалізацыя ўжо ўзгоднена з Надляснічтвам Крынкі.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Мінулае Заблудава

Гісторыя сённяшняга Заблудава пачынаецца перад 1483 годам, калі кіеўскі ваявода Іван сын Ходзькі атрымаў ад вялікага князя літоўскага вялікі абшар пушчаў паміж рэкамі Нарвай і Супраслю. Мясціна гэтая распаложаная ў даліне рэчкі Рудні, якую раней звалі Мялецінкай. У 1483 годзе адбылося нашэсце татарскага хана Гірэя на паўднёвыя землі Вялікага княства Літоўскага і было яно трагічным для кіеўскага ваяводы. Ён быў узяты ў палон і загінуў. Усё ж вялікія князі літоўскія не забыліся пра сям'ю свайго заслужанага падданага.

Кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт I пацвярджае наданні Хадкевічам і сыну ваяводы Івана — Аляксандру Хадкевічу даручае пасаду навагрудскага ваяводы. А. Хадкевіч засноўвае горад на паўднёвым захадзе за Блудаўскай пушчай і ўзводзіць у ім свой палац.

У 1533 годзе Заблудаў атрымоўвае гарадскія правы.

У 1549 годзе памірае Аляксандр Хадкевіч. Заблудаў пераходзіць у спадчыну яго сыну Рыгору Хадкевічу. Горад разрастаецца, наваколле яго заселенае. У 1563 годзе тут паўстаюць царква і касцёл ды пры іх школка для дзяцей. Прыбываюць у Заблудаў маскоўскія першадрукары Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец. Тут яны прыступілі да працы. У сакавіку 1569 года закончылі друкаваць „Учыцельнае евангелле". Гэта была адна з першых друкаваных кніг, якія паявіліся ва Усходняй Славяншчыне. У Заблудаве быў надрукаваны яшчэ „Псалтыр з Часаслоўцам".

Гетман Рыгор Аляксандравіч Хадкевіч дажыў да канца сваіх дзён у Заблудаве. Яго воляй было, каб пасля смерці цела яго пакоілася ў катакомбах Благавешчанскага сабора ў Супраслі. Так і сталася.

Гісторыя ўпісала ў Заблудаў буйны на Падляшшы ў XVII стагоддзі кальвінскі збор і школу пад апекай Хадкевічавага спадчыннікa гетмана Януша Радзівіла. Шведскі „патоп" і звязаныя з ім ваенныя дзеянні знішчылі Заблудаў.

Аб тых адлеглых часах цяпер сведчаць адно магутныя дубы ў колішнім палацовым парку, зарослая чаротам сажалка ды некалькі мураваных збудаванняў у мястэчку.

(мох)

Мая Трансмалдавія

— 11 —

Заначаваць на „агракватэры” дапамагла нам харыстка з манастыра. У доме паломніка не было вольных месцаў. Мы былі рады што можам пабачыць сярэдзіну малдаўскай хаты. З вуліцы выглядае яна надта прывабна, амаль усе дамы ў Цыпаве ўпрыгожаны раслінна-птушынай арнаментоўкай і мазаікай з ромбаў. Жылы двор аддзелены ад вуліцы плотам з белых або жоўтых скалак. А вароты — гэта асаблівая галерэя народнага мастацтва. На іх размаляваныя дзікія кветкі, разнаколерны вінаград, белыя чаплі з жоўтымі нагамі, лебядзіныя пары ды процьма ластавак...

— Ой, які малюсенькі домік, — здзівілася Т., — цікава хто ў ім жыве?

Паколькі домік не быў агароджаны і дзверы да яго былі адчынены насцеж, мы заглянулі ўсярэдзіну. І тут чакала нас знаёмае... Так, гэта быў звычайны вясковы калодзеж, з корбай і ланцугом, на якім было пачэпленае вядро. Кожны хто праходзіў, мог зачарпнуць сабе сцюдзёнай вады і наталіць смагу. Павагу месцу наклікала старая ікона на блакітнай сцяне.

Звонку домік-калодзеж таксама быў размаляваны блакітным колерам, на ім красавалася белая чапля сярод рагозу і балота. Абразок аплятаў арнамент з вінаграднага лісця.

Добры смак псаваў адно шыферны дах, але ўся Малдавія пакрытая шыферам. Можа за выключэннем горада Сарокі, дзе ў сваю чаргу цыганскія палацы ў маўрытанскім стылі прыкрытыя бліскучай бляхай.

* * *

— Не перажывайце! — сказала Валя, — у мяне будзе вам як у раі. — За начлег патрабавала 50 леяў — гэта няцэлыя два долары ад галавы. Яе два дамы, дзе часам спыняюцца паломнікі і турысты, знаходзіцца ля самага манастыра ў Цыпаве.

Валя, вясковая прадаўшчыца, закрыла свой мініяцюрны магазінчык, схаваны ў гушчары грэцкага арэшніку і нават падзякавала нам, што яе „выручылі” ад абавязку. *Бо стаю тут без патрэбы і думаю што згатаваць на вячэру. А мужык з работы неўзабаве прыпрэцца...*

Пры нагодзе высветлілася, што працуе ён „за рэчкай”, у Прыднястроўі.

— А як туды дабіраецца?

Мы ведалі, што самы бліжэйшы мост праз Днестр знаходзіцца за дваццаць кіламетраў ад іх вёскі. Дзяржаўны транспарт зусім не падыходзіў, бо аўтобус прыязджае сюды раз у дзень, пасля абеду. Самым даступным транспартам астаецца тут фурманка.

— А, не-не! — запярэчыла жанчына, калі пачула пра дарогу і мост. — Ён на лодцы туды плавае. Проста, цераз раку, бо калі ўкругавую цераз мост прыйшлося б дзень у дзень дабірацца, дык і на дарогу не зарабіў бы. Муж зарабляе 50 долараў.

— А ці не абстраляюць яго з таго боку, ну, гэта ж Прыднястроўе?

Валя толькі махнула рукой:

— Няма тут як баяцца. У сябе няма працы, а жыць мусова! А там таксама свае людзі!

Валя не хацела сказаць, дзе працуе яе муж:

— Я і сама не ведаю, — адказала нам як малому.

* * *

У Валіным магазінчыку не было нічога з „райскага агарода” — маю на думцы найлепшыя ў свеце памідоры і дыні. Папраўдзе, былі тут толькі неабходныя прадукты: хлеб, цукар, соль, сардзіны ў бляшанцы, пральны парашок, цукеркі, цвікі, кола для ровара...

— І гэта прадукты з Украіны, там танней як у нас, — патлумачыла.

Калі мы ішлі да яе хаты, пабачылі калгасныя астанкі. Карціна напамінала вампірычны комікс. За дзіравым бетонным плотам, сярод пустазелля тырчэлі ў радзе заіржавелыя шкілеты трактароў і камбайнаў для ўборкі памідораў.

— Не перажывайце, — суцешыла нас Валя, — у мяне ўсё ёсць.

Сапраўды, на яе мініяцюрным панадворку, абгароджаным плотам са скалак, хадзіў статак качак, два індыкі, белая каза, куры з баявітым пеўнем, які не дапускаў нас да прыбіральні, што знаходзілася сярод загонаў з вінаградам. У хляўку, таксама са скалак, рохкаў падкормлены парсюк. Нас Валя пасяліла ў новым, яшчэ недакончаным доме, а сама, з сямейкай (мужам і сынком) спынілася ў старой хаціне, дзе гатавалася яда для жывіны і курэй. Стары дом быў збудаваны з гліны змяшанай з саломай і напамінаў аграмадную святліцу. У ім панаваў здаровы халадок і пахла жыццём.

Прыдарожны крыж

Ужо за парогам новага дома з белых пустакоў прывіталі нас дываны. Сярэдзіна хаты напамінала здобную шкатулку. Нашы два пакоі былі да апошняга міліметра абабітыя турэцкімі дыванамі. Падлога і сцены, крэслы і фатэлі — усё было накрытае каляровымі тканінамі. На трохрадавым люстры-„туалетцы” сядзела руская лялька. У спальні чакаў нас сужонскі ложак з ружовай, накрухмаленай пасцеллю. Мы баяліся распакаваць свае рукзакі, каб не папсаваць паху карыцы, які панаваў у пакоях. Калі мы ўжо памыліся халоднай вадой у місцы, Валя запрасіла нас на вячэру. Спецыяльна для нас гаспадыня згатавала ў кацялку мусаку — страву з бульбы, мяса, вэнджанага сальца, цыбулі і памідораў. На стале з'явілася яшчэ духмяная мамалыга, а пасля кавун і вінаград.

Яду мы запівалі віном хатняй работы. У Цыпаве ўсе тосты трэба падымаць у гонар Сцяпана Вялікага. Святы як ніхто спазнаў тайны гэтага напою. Дзякуючы віну, як кажа легенда, кароль перамагаў туркаў. Перад кожнай вайной ён выхіляў поўную чару кактэйлю з трох він: Negru de Purcari, Purpuru de Purcari і Rosu de Purcari.

Малдавія знаходзіцца на дзесятым месцы сярод сусветных вытворцаў віна. Найбольш вядомыя ў свеце маркі паходзяць з падвалаў Крыкава (Cricova), што непадалёк Кішынёва. Гэта свайго роду падзямельная метраполія з „вуліцамі”. Падвалы, якія маюць больш за 100 кіламетраў даўжыні, выкананы ў крэйдавай скале. Вуліцы тут названыя ад марак віна... Але мы туды не заглянулі, а віно з крыкаўскага падвала мы купілі ўжо ў... Беластоку.

Тэкст і фота Евы СЦЕПАНЮК

Вёска Цыпава

Усім установам і людзям добрай волі, якія ўспамаглі нас пры правядзенні дваццаці пяці выпускаў Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі — Гайнаўка, а таксама пры іншых мерапрыемствах, ладжаных Фондам на працягу 10 гадоў яго існавання, выказвем сардэчную падзяку.

Адначасна жадаем усім добрага Новага 2007 года.

Ад імені
Праўлення Фонду
„Царкоўная музыка”
ў Гайнаўцы
Мікола Бушко

Новы Год і Каляды

Як Новы год і святы
Будуць намі прыняты?
Нецікава і штучна,
Маланкава і гучна.

Без любві Раждяство
Нас у грэх панясло.
Адвернемся адгэтуль —
У Хрыста наша мэта.

Ён сярод цёмнай ночы
Падаў свет нам у вочы
І царам-мудрацам
Зорку праўды паслаў.

Ён радзіўся ў пячоры
Пад калядныя зоры,
Даць нам ціхі ратунак
Ад галосных разгулаў.

Хай жа гэты Год новы
Дасць нам добрыя плёны,
Хай у сэрцах пасее
Любоў, Веру, Надзею.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Шчырая падзяка

Напрыканцы лістапада і пачатку снежня 2006 г. давялося мне пабываць у беластоцкай паліклініцы МУСіА, на герыятрычным аддзяленні. Ардынатарам гэтага аддзялення з'яўляецца праф. д-р габ. мед. Барбара Бень, а лекарамі сп.сп. Вільманская, Войшэль, Яньчак і Гулай. Усе яны вельмі ветліва адносяцца да пацыентаў, гавораць з імі, заўсёды скажуць добрае слова. Хворы не пачуе таксама дрэннага слова ад сярэдняга і ніжэйшага персаналу. Медсёстры, праца якіх нялёгкая і адказная, пры хворых заўсёды ветлівыя. Прыбіральшчыцы сочаць за чысцінёю і парадкам на аддзяленні.

Я, як былы пацыент герыятрычнага аддзялення (а ляжаў там ужо не першы раз), хачу праз пасрэдніцтва тыднёвіка „Ніва” перадаць усяму персаналу словы шчырай падзякі за добрую медычную апеку і пажадаць усім у новым 2007 годзе моцнага здароўя і шчасця.

М. Л.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

— 56 —

Захварэла мама, паехала ў бальніцу. Калі звычайны дзень, дык часам і не заўважыш, каго няма дома: кожны ідзе на працу, у школу. Зімой так ад цямна да цямна. А нават увечары ды, калі разам не вячэраюць, дык і так невядома, хто ёсць дома, а каго няма; кожны займаецца сваімі справамі. Адно Грак і Мікітка заўжды на сваім месцы — таму і відаць ім, калі каго няма. А на іх сёння нават ніхто не ўглядаецца — рабі што хочаш, хоць ты ставай на галаве. Ды тата адкінуў сваю газету — вось навіна! І нейкім больш прытомным зрокам глядзіць на людзей і звяроў, спачатку бы нарадзіўшыся нанова. А гэта толькі — мамы няма!

— Гражынка, ці не трэба табе праверыць урокі? — пацікавіўся тата.

— Без абразы, а ці памятаеш, тата, у якім я класе?

— Як у якім? Ты ж хіба ведаеш сама?

— Мне ж даўно не трэба правяраць урокі!

— А то і добра, бо я сам ужо шмат што забыўся. Тое, што ты ведаеш, нас у ліцэі вучылі. Здаў атэстат сталасці, дык адразу забыўся.

— Шчыры, шчыры ў нас тата, — прабомкаў Грак.

— Што ты кажаш? — тата вырачыў вочы на птаха. — Дык што такое, наш Грак умее па-нашаму гаварыць?

— Гэта ты па-нашаму пачуў! — бабуля выцерла талерку ручнікам, быццам намервалася нацерці тату патыліцу. — Чуеш, Грак?

— Можна тату дараваць! — Грак вяла махнуў крылом. — Ці ўсе чалавечыя мужчыны такія?

— Гэта каму за сорак! — растлумачыла бабуля невядома каму.

Найбольш цікавіўся яе словамі Мікітка, які гуляў клубочкам, паўтараючы, „сорррррак, сорррак” — вельмі ж падабалася яму вуркатаць па-даросламу.

— Ой, мама звоніць! — спахапілася бабуля. — Пытаецца, як трымаецца наш тата. Вядома, усё ў парадку. Усе нашы хлопцы ў парадку — і тата, і Грак, і Мікітка. А мы, дзяўчаты, усё трымаем на галаве.

Мікітка паглядзеў на бабуліну галаву, што схілялася над прутками — бабуля вязала шалік. І на Гражынчыну галоўку над кніжкай: „Ня-я-я-я-яма там ніцога...” — і пагнаўся за клубочкам. А тата ўсадзіў нос у газету.

Міра ЛУКША

XI Сустрэчы Нарва — Гарадок

Настаўніца Ніна Абрамюк вітае гасцей. У першым радзе злева: Анна Грыцук — дырэктар гімназіі з Гарадка, Аліна Кананюк — дырэктар гімназіі ў Нарве, спадар Касацкі, Ёлянта Грыгарук — метадыст беларускай мовы, Эля Калток — настаўніца беларускай мовы з Гарадка

Публіка

У адзін лістападаўскі вечар 2006 года ў нарваўскай Гімназіі адбылася вечарына пад лозунгам „У нас так — а як у вас?”. У вечарыне ўдзельнічалі запрошаныя госці: Іаланта Грыгарук — метадыст па беларускай мове, Анна Грыцук — дырэктарка гарадоцкай Гімназіі і Альжбета Колтак, настаўніца беларускай мовы.

Гаспадары цешацца — адзінаццатае спатканне вучняў Нарвы і Гарадка адбылося паспяхова. Адзінаццаты раз у гэтым спатканні ўдзельнічаў спадар Пётр Касацкі — бацька нашых сяброў. Гэта абазначае, што твочасць абедзвюх школ ад пачатку мае фанатаў. Вучні з Нарвы выказаліся вялікім мастацкім талентам. Пастаноўкі „Мікітаў лапаць” і „Касічка” вельмі ўсім спадабаліся. Вучні з Гарадка таксама падрыхтавалі жартоўную сцэнку „Дзед і баба”. Яна была кароценькая, але вельмі цікавая.

Пасля мастацкай часткі настаўніцы і вучні абмяняліся падарункамі. Далей прыйшоў час на пачастунак. Потым вучні гулялі ў конкурсы. На жаль, не ўсе запланаваныя адбыліся, так моцна хацелася ўсім танцаваць! Ну, што ж. Гэта ж моладзь.

Кася СЯНЬКЕВІЧ, гімназістка з Нарвы, фота Яраслава Іванюка

Выступаюць гарадоцкія акцёры

Яўхім прыехаўшы з поля разважае пра паводзіны сваёй жонкі

Ці патрэбна нам зіма?

Жыў-быў Дзядок-Гадавічок. Было ў яго чацвёра дзяцей: Зіма, Вясна, Лета і Восень. Кожны год прыходзілі яны на зямлю да людзей і правілі там па тры месяцы.

Вырашыў Дзядок-Гадавічок праверыць, як яго дзеці працуюць і як любяць іх людзі. Спусціўся ён на зямлю і пачуў, што Вясну хваляць за прыгажосць, Лета — за цеплыню, Восень — за ўраджай, а Зіму толькі дакараюць за мяцеліцы, холад, мароз. Раззлаваўся Дзядок на Зіму і пакараў яе, запёршы ў святліцы, а Восені сказаў:

— Адслужыш тры месяцы за Зіму.

Мінулі асеннія месяцы. Чакаюць людзі першага сняжку, першага марозіку, а Зімы няма ды няма. Снежань месяц на дварэ, а на вуліцы ўсё яшчэ хлюпата, дождж і туман. Затужылі людзі:

— Хутка Новы год, а мы яшчэ снегу не бачылі.

— Калі і далей будуць ісці дажджы, усю нашу азіміну вымые. Зерне сілы не набярэцца. Значыць, будучай восенню застанемся без хлеба.

— Дарогі так размыла, што ні праехаць, ні прайсці.

І звярам цяжка давялося ў гэту пару.

Заяц хваляваўся:

— Памяняў футэрка на белае, а цяпер пакутую. Воўк і Ліса здалёк мяне, белага, убачаць на цёмнай зямлі.

Мядзведзь бурчаў:

— Лёг у бярлогу спаць, а яе вадой ужо які раз затапіла. І сонца няма, каб высушыцца.

Сабраліся людзі і звяры на раду і вырашылі паслаць да Дзядка-Гадавічка Сароку, каб расказала пра беды людзей і звяроў, пра тое як чакаюць усе Зіму. Чакаюць і першага снегу, і марозу, і мяцеліцы. Зразумелі ўсе, што дарэмна Зіму лаялі.

— Ну што ж. Калі так, няхай ідзе Зіма на зямлю, — сказаў Дзядок-Гадавічок і адпусціў яе.

І перад самым Новым годам прыйшла Зіма. Накрыла палі пушыстай белай коўдрай, размалявала вокны марознымі ўзорамі, на радасць дзятве намяла высокія гурбы.

Як ніколі весела сустрэлі людзі і звяры прыход Зімы.

Лена КАРНЕЕВА, г. Мінск, СШ № 129 „Казкі дзяцей Беларусі”

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 12 —

Перад святочнымі канікуламі наша выхавацелька наладзіла Куццю. Тыдзень да гэтай сустрэчы Соня пачала збіраць у класе складчыну на святочнае застолле. На жаль, ніхто не хацеў прынесці грошы, на якія мы раней дамовіліся з Аўрэліяй. Два дні да Куцці грошы прынеслі Марта, Ксеня, Паўл, Матфейка і я. Апрача нас не было больш ахвотных, кожны круціў як мог, маўляў, што збяднее з-за гэтых дробных грашакоў. І паабяцалі, што не будуць есці з намі Куцці. Аўрэлія знервавалася гэтай партызаншчынай, яна таксама сказала, што да святочнай вячэры сядуць адно тыя вучні, якія не паскупілі пяці злотых на яду. Усе яе разумелі, ніхто нават не пратэставаў, не абураўся.

На пачатку мы падзяліліся аплаткай і просвірай. Гэтая ўрачыстая хвіліна мінула як міг, ніхто не пастараўся нават прыдумаць каларытных пажаданняў, усе паўтарылі адно: *З Калядамі!*

Марта, якая ходзіць у музычную школу, пачала іграць на скрыпцы. Аднак Міколка і Ігар стараліся перакрычаць яе ігру. Яны крычалі абы-што, каб толькі ўчыніць закалот. У той самы час, тыя што заплацілі складчыну, елі аладкі і салодкія пірагі, якія купіла (за сабраныя грошы) Соня. Гэта была вельмі смешная карцінка, шэсць асоб сядзела сабе за сталом, а апошнія — строілі з нас жарты! У пэўны момант Аўрэлія, Ксеня і Кася перайшлі ў другі канец залы, каб там слухаць ігры на скрыпцы. Міколка толькі чакаў такога, ён дарваўся да стала, ды загарнуў у свае кішэні цукеркі. Ён таксама сабраў мандарыны і пачаў імі рассідвацца па класе. Ігар выліваў сок, а мы з Ганкай і Матфейкам рабілі мікстуру: да аранжавага соку мы далівалі кока-колу і кідалі туды цукеркі. Міколка нават пачаў гэта піць, але калі пакаштаваў кактэйль, раздумаўся. Наша выхавацелька ўвогуле не хвалявалася. Яна прыкідвалася быццам нічога не бачыць...

І ўсё было б як належыць... Аднак, пяць хвілін да званка ў наш клас зайшоў настаўнік рэлігіі. Нягарчук прыйшоў да нас спытацца чаму ніхто з нашага класа не прыходзіць на ўрокі рэлігіі. Калі Нягарчук пабачыў нашае пекла, ён толькі схапіўся за галаву і выйшаў без слова. Аўрэлія выбегла за ім, яна пачала прасіць, каб той не гаварыў пра нашу Куццю спадарыні Воўк.

Тады мы сапраўды напалохаліся! Мы ўміг прыбралі залу, дружна заселі ўсім класам за стол і сталі спяваць калядкі...

Мы баяліся, што калі спадарыня Воўк наведае наш клас, яна напэўна выкіне нашу выхавацельку з працы, а нас „перамяшае" з нейкім іншым класам. А такога я б не перажыла.



Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн: <lolcia05@wp.pl>

Галерэя „Зоркі" (Нарва)

Кася Сянькевіч

фота Яраслава Іванюка

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні: 5,0.

Твая мянушка: Пакуль што, няма.

У жыцці хачу стаць, чаму: Перш за ўсё, хачу стаць мастачкай. Апрача мастацтва мяне вельмі цікавяць музыка і паэзія. Вельмі хачу сваё жыццё звязаць таксама з гэтымі відамі творчасці. Люблю маляваць, пісаць вершы і музыкаваць.

У сяброў цаню: Спакой, цярплівасць і скромнасць.

Не люблю: Калі адны людзі выношваюцца па-над другімі, у канцы ўсе ж мы нарадзіліся роўнымі!

Па-беларуску размаўляю: Амаль з усёй сям'ёй.

Мой любімы гурт: „The Rasmus", ён заўсёды ў мяне на першым месцы сярод гуртоў. Часам слухаю таксама „Björk", а нядаўна слухала песні з „Басовішча".

Каля свайго дому пасаджу: Я яшчэ ніколі не думала пра гэта. Аднак могуць быць гэта ружы і... апельсіны. Дакладна, цяжка сказаць.

Вершы Віктара Шведа

Пасведчанне з паяском

— Пасведчанне якое
Ты атрымаў, Лявоне?
Ці нейкае благое,
Ці з паяском чырвоным?

— Пасведчанне я ў школе
Атрымаў, вядома.
А паяском да болю
Дастаў ад бацькі дома.

Адпушчэнне грахоў

Настаўнік Божага закона
Спытаўся на ўроку Лявона:
— Што трэба рабіць пастаянна
Каб мець грахоў дараванне?

Лявон пастаяў у спакоі
І раптам прыдумаў такое:
— Хіба грашыць раней трэба
Каб грэх адпусціць магло неба.

Польска-беларуская крыжаванка № 1



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 50: Дух, шапка, бас, журавіны, парэй, насып, бант, Ася, драка, стог, кант, тэлеграф. Дух, удот, жаба, бурак, арэна, сайт, шпінат, насок, прысяга, не, акупант.

Узнагароды, **фламастэры**, выйгралі: **Марта Каранецкая** з Нарвы, **Кшыштаф Грыгарук, Мажэна Дзмітрук, Наталля Янцэвіч, Дыяна Капытка** з Чыжоў. **Віншуем!**

Найпрыгажэйшая — душа

Размова з Зояй ЛУЦЭВІЧ, мастачкай з Мінска.

„Ніва": — Сёння лёгка быць мастаком у Беларусі?

Зоя Луцэвіч: — Мне не хочацца нават думаць аб сітуацыі ў Беларусі ў гэтым аспекце. Наогул у свеце мастакам сёння жывецца цяжка. У сувязі з эканамічнымі зменамі ў свеце людзі перасталі выдаваць грошы на мастацтва. Таму мастакі штораз часцей пачалі шукаць сабе дадатковых крыніц заробкаў, бяруцца за педагагічныя працы ці ў галіне інфарматыкі або дызайну, а не толькі займаюцца графікай ці жывапісам і г.д. Такая ж сітуацыя і ў Беларусі. Пры старым, камуністычным рэжыме мастакам надзяляліся акрэсленыя сродкі. Былі вельмі танныя майстэрні. Цяпер у сапраўднасці невядома, які маем рэжым. Мы не з'яўляемся ў поўным значэнні капіталістычнай краінай, ды адносіны пануюць тут вельмі капіталістычныя; даражэе жыццё, бяднеюць людзі. Мы, мастакі, аднак, не трацім духу. Мы адданыя мастацтву раз і назаўсёды. Ёсць мастакі, якім патрэбная свабода, але і такія, якім яна не ёсць неабходнай. Так ужо яно ёсць. На жаль, наша краіна поўнасцю закрытая. Я пакутую ад гэтага. Некаторыя гавораць, што гэта віна Лукашэнкі. А мне здаецца, што гэта Еўропа нас здрадзіла, спусціла ва ўнітаз. Еўропа, калі хоча, каб штосьці змянілася ў Беларусі, мусіць паказаць як жыць, што змяніць. Калі б чалавека зачыніць у скрыні, да таго з кімсьці іншым, то той другі будзе думаць, што так мусіць быць, што тая скрыня з'яўляецца яго айчынай. У Беларусі для мастака найгоршыя недахоп інфармацыі і з'яўленне мастацтва звонку. Ніхто цікавы да нас не прыязджае. Я баюся за будучае пакаленне, якое, мабыць, не будзе ведаць, што ў сапраўднасці такое сучаснае мастацтва, культура.

— А як Вы асабіста спраўляецеся ў такой сітуацыі?

— Літаральна да нядаўна я лічыла, што змагу забяспечыць сябе матэрыяльна як мастак. Я жыла выключна з продажу сваіх прац. Цяпер, на жаль, жыву дзякуючы дапамозе маіх бацькоў. Час ад часу ўдаецца прадаць мне нейкую карціну. Паявіўся шанц, што буду працаваць у адной з галерэй і тут зараблю на па меры нармальнае жыццё.

— Чым для беларуса з'яўляецца аўтамашына?

— Аўтамашына? Уся Беларусь гэта склад старых аўто. „Шрот" з усяе Еўропы трапляе ў першую чаргу ў Беларусь, бо гэта першая краіна за мяжой аб'яднанай Еўропы, хоць беларусы мяркуюць, што мы еўрапейскі цэнтр, хоць я сама не разумею, што ж гэта за такі цэнтр. Цяпер аўто ў Беларусі даражэйшыя, хоць быў час, калі каштавалі няшмат. Гэта ў большасці старыя, раней цалкам эксплуатаваныя машыны, і часта бывае так, што хутка трапляюць на аўтазвалку. Ды я разумею, што ў вашым пытанні вы спасылаецеся на маё апошняе мастацкае мерапрыемства — „Аўтапраекта" *(смех)*. Сама назва гэта такая слоўная гульня: аўта — аўтарскі праект і аўто — аўтамабільны праект. У сваёй творчасці я часта выкарыстоўваю нікому непатрэбныя рэчы. І калі мае знаёмыя трапілі ў аўтааварыю, аддалі мне ўцалелае лабавое шкло. Шыбіна стаяла ў мяне год. Я не ведала, што з ёю рабіць. Здалося мне, што проста намаляваць на ёй карціну — гэта нецікава. Аднойчы я паставіла за ёю лямпу, а паміж імі ліст паперы. Адкрыўся перада мною вельмі цікавы эфект; шыбіна перастала быць выключна аўтамашынным элементам, а стала зусім іншым прадметам, з самастойным жыццём. Тады я падумала, што варта зрабіць цэлую серыю такіх „падсвечваных" шыбін. Аказалася, што гэтую ідэю можна развіваць тэматычна на розны спосаб. Гэта падобнае на дзіцячую гульню. Ды хай будзе ясным: я да ўсяго, што раблю ў мастацтве, адношуся вельмі ўсур'ёз, хоць ствараю творы незусім сур'ёзныя. Хопіць нам філасофіі ў мастацтве. Я расказваю смешныя гісторыі, анекдоты.

Зоя Луцэвіч (1970 г. нар.) — адна з найвыдатных беларускіх мастакоў пакалення саракагодкаў. Нарадзілася ў Мінску. Вучылася ў мінскім мастацкім ліцэі імя А. К. Глебава. Штудзіравала ў 1989-1992 гг. у Беларускай акадэміі мастацтваў, адкуль яе выкінулі. Наступныя тры гады вучылася ў Акадэміі мастацтва ў Дзюсельдарфе. Паралельна парцавала ў Галерэі „Гасп" у Аўстрыі. Выстаўляла свае парцы м.ін. у Расіі, Латвіі, Аўстрыі, Балгарыі, ЗША, Нямеччыне. У апошні час яе працы з цыкла „Аўтапраект" прэзентуюцца ў варшаўскай галерэі „Zoya", якая мае назву ад яе імя, а якую заснаваў і вядзе Дарыюш Жукоўскі, ураджэнец Гарадка. Некалькі тыдняў таму, разам з мастакамі з усяе Еўропы, удзельнічала ў мастацкім пленэры „Inter Winter" у сяле Буды, непадалёку Гайнаўкі і Белавежы.

— А што Вам удаецца ўбачыць праз тыя шыбіны?

— Гэта цікавае пытанне. Калі б прадметы ўмелі гаварыць, расказалі б нам шмат цікавага. Прадметы, якія стаяць дома ці даўно ўрослыя ў вуліцу, не скажуць нам зашмат, мала бачаць. А аўтамашынная шыбіна бачыць шмат, мноства праз яе і з ёю тварыцца. Прамільгваюць праз яе фрагменты краявідаў, дарог, людзей. Аўтамашынная шыбіна — вартаўнік памяці. Трэба толькі знайсці ключ, каб адкрыць, адчыніць тую памяць.

— У мяне ўражанне: ці Вы не „гарадская" мастачка?

— Шмат мастакоў любіць спасылацца на сваё дзяцінства ці, напрыклад, на свае сны. У мяне таксама быў такі перыяд. Аднак, у гэтым узросце, калі я дайша да вываду, што ўжо несамавіта ўсё гаварыць пра свае ўспаміны з маленства і сны. Мне ўжо хапіла гаварыць пра самую сябе. Хочацца мне гаварыць аб нас. Вёска настолькі спакойная, што я магу пабыць там тыдзень, адпачыць. Горад напоўнены дынамікай, эмоцыямі, падзеямі. Я з'яўляюся чалавекам, якому патрэбны якраз такія перажыванні. Не магу быць адна. Люблю быць з людзьмі, слухаць іх і таксама шмат гаварыць, люблю круціцца. Люблю горад, знаёміцца з новым і аб гэтым гаварыць. Такі ў мяне проста характар.

— А няма ў Вас ахвоты пашукаць тое, што называецца беларушчынай?

— Мяне выкінулі ў 1992 годзе з Беларускай акадэміі мастацтваў якраз таму, што быццам бы ўва мне не было дастаткова многа беларушчыны...

— ... Даруйце, ды ў якім сэнсе?

— *(смех)* Ну, вось. Гэта добрае пытанне. Я не ведаю, у якім. Пасля, у Акадэміі мастацтва ў Дзюсельдарфе гаварылі, што беларушчына ўва мне ёсць, хоць я ўсё не ведала, у чым справа. Тады, у Мінску, на пачатку дзевяностых, у адзін дзень вырашылі нам завінціць гайку. З Тэатральна-мастацкага інстытута, свабоднага і вельмі цікавага, зрабілі Акадэмію мастацтваў. За адзін дзень змянілася назва і прынцыпы. Мяне выкінулі, бо я пачала рабіць выставы, чаго студэнты рабіць не маглі. Для мяне гэта немагчыма для ўяўлення, чаму ўвогуле мастакі вучацца, калі не могуць называцца артыстамі, падпісвацца пад сваімі працамі. Калі можна называцца мастаком і падпісвацца пад сваімі карцінамі, паказваць працы навонкі, — тады адкрываць сябе, поўнасцю адказваць за якасць твораў, удасканальвацца. Для студэнтаў паказваць свае працы ад самога пачатку гэта ўмець паглядзець на сябе збоку. А што тычыцца беларушчыны, нацыянальнасці. Мастак гэта інтэрнацыянал і пацыфіст. Не можа быць сапраўдны мастак нацыяналістам. Вядома, ёсць вылучэнні. Цяжка разам рабіць выставы, дзяліцца палітрай, а станавіцца па абодвух баках барыкады. Калі б мастакоў было больш на свеце, то і свет быў бы лепшы. Падобна, калі б светам кіравалі жанчыны, было б меней войнаў.

— Значыць, Вы — феміністка?

— Адкуль жа! Проста бачу, колькі дурнотаў нарабілі мужчыны. Я нават супраць фемінізму. Хачу быць жанчынай, а гэта, што ёй з'яўляюся, вельмі мне падабаецца. Люблю, калі за мной ходзяць, дбаюць аб мяне. Падабаецца мне нараджанне дзяцей. Падабаецца мне вельмі старацца за мужчыну. З радасцю іду з мужчынам у пасцель. Магу яму нават вычысціць боты. Найпрыгажэйшая, аднак, чалавечая душа. Усё апошняе можна выкінуць у сметніцу. Чалавек без душы гэта незразумелая істота.

— У адной з прац з цыкла „Аўтапраект" на той лабавой шыбіне напісалі Вы на шмат якіх мовах каляровыя словы „х...". Ці я добра разумею запавет? Мужчыны гэта х...?

— *(смех)* Некаторыя мужчыны гэта толькі х... Іншыя павінны старацца, каб х... не быць. Гэтая праца, вядома, жарт. Датычыла яна менавіта аб'яднанай Еўропы. Часта пытаюцца ў мяне, адкуль мне вядома гэтае слова на столькіх мовах. Заўжды хочацца мне адказаць: я проста ведаю ўсіх гэтых людзей.

— Дзяжурнае пытанне: хто для Вас з'яўляецца аўтарытэтам сёння?

— Гэта складанае пытанне. Сёння не магу адназначна адказаць, назваць той адзін. У мяне пастаянныя аўтарытэты. Гэта як з улюбёнымі кніжкамі з дзяцінства. Магу пералічыць. Анры Маціс. Я пад уражаннем сербскага мастака Зорана Музіча. А так агульна дык чэрпаю энергію перш за ўсё з космасу.

— Дзякую за размову.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Чатырох мушкецёраў

Быць карысным, салідарным, стаць басаўцам і не забываць пра старэйшых сяброў — такога зместу прысягу давалі сёлета першакурснікі беларускай філалогіі на атрасінах у Супраслі. Ага, яшчэ павышаць узровень атрасінаў і прынамсі раз у год наведаць дачу Алега Латышонка. Можа не да канца так гучалі словы прысягі, але, вядома, самы важны сэнс ды мэта, а неабавязкова дарога да яе... Шлях да атрасінаў, аднак, вельмі прыемны, не наракалі і тыя, што на сваіх машынах ехалі, але і тыя, што з аўтобуса ці з падсадкі ішлі пару кіламетраў, нібыта ў студэнцкую Мекку. Нічога дзіўнага, спадар Латышонак не толькі выкладчык, але і гарачы прыхільнік студэнцкіх ініцыятыў.

Дзякуючы рашучасці некалькіх студэнтаў-басаўцаў, пасля адтэрмінаваных атрасінаў, першапачаткова планаваных у лістападзе, адбыліся яны ў снежні. Шчасліва, бо хто ведае ці не адбыліся яны апошні раз. Нібыта атрэслі палову курсу, але не кожны пэўна ведае, што налічвае ён восем асоб! Прыехалі, здаецца, тыя найбольш свядомыя і перакананыя ў сваіх выбарах, дзве асобы з Гайнаўкі, хлопец з Орлі, але і Алесь, які прымушаны быў пераехаць у Польшчу для атрымання вышэйшай адукацыі і рашыў паступіць на беларускую філалогію. Каб гэтыя добраахвотнікі свабодна сябе адчувалі, арганізатары прыехалі на месца атрасінаў дзень раней, напалілі ў печках, падрыхтавалі пачастунак і, вядома, спаборніцтвы! Старэйшае студэнцтва праверыла ўзровень падрыхтоўкі маладых да новага жыццёвага перыяду на розныя спосабы і хаця не хапала часам дысцыпліны, канчаткова першакурснікі аказаліся вельмі адкрытымі. Ад пачатку іхнія твары паказвалі вялікае чаканне. І дачакаліся. Усе перайшлі на трэці паверх, дзе сабраных прывіталі смачна накрытыя сталы і... прывітальная чарка. Чарак на працягу вечара было больш, але, вядома, на пачатку трэба было дадаць смеласці. Хто б яе не патрабаваў, калі б прыйшлося з маленькіх шарыкаў смактаць малако! Цяжка было хлопцаў заахвоціць, але дух канкурэнцыі ім дапамог. Дзякуючы праніклівасці гаспадара, спраўна ўдалося затым правесці каламбуры, бо ўдзельнікі паказалі, што нялёгка нарысаваць на картцы свабоду! Як на гаспадарцы бывае і папрацаваць трэба, а калі на працу — толькі ў чыстых ботах! Таму хлопцы навыперадкі шаравалі чобаты Латышонка. Аднак, праверылі не толькі хуткасць. Прыгадваецца мне флеш-моб «Моладзь чытае „Ніву"» — першакурснікі паказалі наколькі ведаюць кірыліцу напрыканцы семестра, толькі што ў голас. Паверце, было весела! Пасля лёгкай размінкі прыйшоў кульмінацыйны момант, экзамен па супрацоўніцтве, спроба сіл і вялікая неспадзяванка! Як прыемна было глядзець, калі ўсе супольна знізу, ад ракі, пхалі сапсаваную „Ладу" арганізатара. Галоўнае — умець захапіць!

Пасля апошняга змагання ўсе згодна і шчасліва вярнуліся ў хату, дзе працягвалі гульню да наступнага дня. Адны стомленыя інтэнсіўнасцю падзеяў лягалі спаць, другія пачыналі сур'ёзныя дыскусіі пра значэнне Супрасльскай лаўры ў прамоцыі Супрасля і яго наваколля. Значыць, атмасфера месца паўплывала на беларускіх студэнтаў зусім па-рознаму, а і стараннi басаўцаў не пайшлі дарма. Чатырох студэнцікаў першага курса беларускай філалогіі сталі проста СТУДЭНТАМІ.

Басаўка

Маладое кіно

Квіткі ў кіно не належаць да танейшых прыемнасцей. Тым, якія хочуць пабываць на кінаглядах, культработнікі Беластоцкага асяродка культуры стараюцца пару разоў у год выйсці насупраць і запрэзентаваць цікавае андэрграўнднае кіно з розных месцаў Польшчы і свету.

Кіно — гэта з'ява, гэта нейкае ўяўленне, як можна бачыць, слухаць, як можна адчуваць, гэта візуалізацыя людскіх імгненняў, пра якія часта ўголас не кажуць. Баяцца? Не, ведаюць, што жыццё і кіно гэта розныя рэчы, але на колькі гэта магчымае, трэба прыбліжваць адно аднаму. Часам удаецца патрапіць на людзей, якім займае час думанне пра развіццё культурнага жыцця, але самыя важныя тыя, якія нешта робяць. Для прыкладу, займаюцца інфармацыяй пра маладое кіно ў Польшчы. А ёсць чым займацца...

Культурнае падполле заўсёды прэзентуе своеасаблівы падыход да жыцця, не ўцякае ад суб'ектыўнага погляду на другога чалавека і спраў, якімі займаецца. Каб захаваць гэтую адметнасць, звычайна трэба пашыраць кола зацікаўленых гэтымі тэмамі, а ў сённяшнім свеце гэта не так складана, таму што візуальнае мастацтва вельмі папулярнае і лёгкае ва ўспрыманні. Пару гадоў таму сяброўскі калектыў вырашыў пачаць прапагандысцкую акцыю па пашырэнні ведаў пра плыні ў фільмавай дзейнасці, але, перш за ўсё, каб паказаць маладым людзям чым можна займацца, як правесці свабодны час, як гаварыць пра свае справы, у канцы — як можна глядзець на жыццё і мастацтва. Таму менавіта ў 2004 годзе паўстала ініцыятыва „Фільмавае Падляшша атакуе". Гэтая акцыя прыцягвае ўвагу маладых творцаў, якія намерваюцца дзяліцца сваімі думкамі з іншымі. І вось такім чынам цэлы год збіраюцца, альтэрнатыўныя да галоўнага напрамку, фільмавыя карціны аўтарства людзей з Падляшша, але і тых, якія тут нарадзіліся, але цяпер жывуць ад нас далёка, у Заходняй Еўропе ці Злучаных Штатах. Цікавае, што на працягу двух гадоў акцыя пашырылася настолькі, што паўстае ўжо чацёрты выпуск „фільмавага Падляшша". Да гэтага часу фільмы дэманстраваліся ўжо ў больш за пяцьдзесят гарадах Польшчы, а па-за межамі нашай краіны: у Чэхіі, Нямеччыне, Беларусі, Украіне, Літве, Латвіі. Самае прыемнае, што кола маладых творцаў, якія хочуць паказваць свае фільмы, пашыраецца. Дасылаюць яны відэа, сюжэтныя фільмы, кароткія формы, абсалютна неабмежаваныя тэмы, ёсць і тэледыскі, дакументы інспіраваныя жыццём людзей на Падляшшы, паводзінамі маладых людзей, тэмы, якія кранаюць сучаснасці ў звычайным жыцці і палітыцы. Гэта спосаб зацікавіць даволі шырокае кола гледачоў, таму што найлепш канструяваць паказ так, каб кожны знайшоў нешта сабе.

Апошні паказ меў месца ў Любліне. І хаця гэта быў чацвер, сярэдзіна тыдня, у Цэнтры культуры сабралася 60-70 чалавек. А бывае па-рознаму, часам прыходзіць дзве сотні людзей, а здарылася і так, што ў час аднаго з паказаў у Нямеччыне прыйшло двое. Усё залежыць ад месца, рэкламы і таго, наколькі гэтае месца вядомае дзейнасцю, якая спрыяе прамоцыі незалежнай культуры. У Любліне паказалі трэці выпуск „фільмавага Падляшша". Гэта падборка некалькіх разнастайных поглядаў на фільмавую творчасць. Пачынаецца ўсё з відэакліпа Рафала Янушчыка з Элку, які цяпер жыве ды творыць у Злучаных Штатах. Далей вобраз узмацняецца, асоба мужчыны ў трывожных сценах, над музыкай дамінуюць дзіўныя галасы, усё разам вельмі таямнічае: гэта частка бескампрамісной творчасці Мацька Шупіцы — графіка, скульптара, рэжысёра, нават музыканта, які штодзень па-мастацку працуе з групай „Dick for dick" і таксама рэалізуе відэакліпы. Фільмавымі жартамі ж з'яўляюцца кароткія формы Войтка Каранкевіча з Беластока, які апошнім часам пасля шматгадовай журналісцкай ды мастацкай працы хацеў увайсці ў самаўрадавую палітыку. Экстрэмальнае кіно прадстаўляў Air Lulek, які здымаў фільмы ў час скокаў з парашутам. Можна было паглядзець жаночы падыход да мастацтва ў выкананні Анэты Алтажэўскай. Аўдыторыя смехам узнагародзіла фільм Войтка Шчытко пра паездку ў Злучаныя Штаты за працай ды накарціну беластоцкай групы Hermanos de Chamuco „Шкоднікі ў агародзе". Прэзентаваны быў таксама фільм „Прыедзь да мяне" Пшэмка Млынчыка, прафесійнага рэжысёра, народжанага ў Беластоку, які вучыўся ў Чэхіі, ЗША і Расіі. Паявілася і „памежная" анімацыя групы Los Marias Denudas, што цікава, героямі якой з'яўляюцца два зубры і... Аляксандр Лукашэнка. Удалося зацікавіць гледачоў нават пасля паказу, калі частка публікі распытвала пра вядомых сабе людзей з Беластока, а іншыя прабавалі ацэньваць пабачанае. Галоўнае, што фільмы часта выклікалі ўсмешку, а часам і сапраўдны смех. Гэта самая пазітыўная ацэнка, таму што асновай гэтага роду творчасці з'яўляецца даволі свабодны падыход да самога мастацкага акту, а ідэйнасць адпавядае толькі і выключна становішчу аўтара. Гэта надзея для мастацтва і гэтак званы „фрыстайл", так патрэбны сёння кожнаму, хто пачынае і канчае дзень інфармацыяй пра чарговы абсурд жыцця ды палітыкі.

Ілона КАРПЮК

Развіццё культуры непарыўна звязана з міфамі і вераваннямі, крыніцы якіх знаходзяцца ў першабытнай гісторыі людскога роду. З развіццём сацыяльных адносін змянялася стаўленне чалавечай істоты да ўсяго невядомага, а таму страшнага. Мноства чалавечых страхаў сышло ў нябыт з усталяваннем адзінабожжа. Разам з тым моц традыцый і сувязей нашых суродзічаў з прыродай праяўляецца паўсюль. Таксама паўсюль людзі стараюцца аберагчыся ад тых непажаданых наступстваў, якія яны здольныя разглядзець у розных прыкметах ці з'явах. Таму дагэтуль жывыя і запатрабаваныя разнастайныя талісманы, амулеты і абярэгі, якія, па меркаванню іх уладальнікаў, тояць у сабе нейкую сілу — добрую ці злую — залежаць ад прызначэння.

Сёння ў Беларусі ў рэальнасці няма якой-небудзь музейнай установы, якая б мэтанакіравана збірала прадметы аховы ад няшчасцяў ці нячыстай сілы. Але для натхнёных руплівцаў на ніве даследавання народных традыцый гэтая акалічнасць не перашкода. І яны ствараюць віртуальны музей, білетам у які ёсць доступ у Інтэрнэт.

Калі мы набярэм на сваім камп'ютэры адрас http://www.obereg.of.by, то адкрыецца змрочна-чорнае выяўленне, зверху аздобленае начным небам з вялікім поўным месяцам і безліччу зорак. У цемры праяўляюцца сілуэты нейкага паселішча.

З першага погляду падаецца, што мы трапілі на сайт нейкіх акультыстаў-сатаністаў, але размешчаная з левага боку эмблема і надпіс каля яе разганяе чорныя, як выяўленне, думкі. „Цэнтр па вывучэнні і захаванні нематэрыяльнай спадчыны беларусаў. Музей традыцыйных беларускіх абярэгаў" — так называецца сайт, створаны выкладчыкамі і студэнтамі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Без перабольшвання трэба прызнаць, што праца па стварэнні сайта праведзена немалая. Аб гэтым сведчаць насычаныя інфармацыяй рубрыкі партала. Аўтары падзяляюць усе абярэгі на абярэгі чалавечыя, абярэгі хаты і абярэгі гаспадаркі. Першыя падзяляюцца на каляндарныя, сямейна-родавыя і аказіяльныя. Так, свечка запаленая на Хрышчэнне альбо Вялікдзень нясе ў сваім агні ачышчальную функцыю. Таму нават воск з такой свечкі будзе мець карысныя свойствы яшчэ і ў вуллях.

Традыцыя не падмятаць падлогу ў дзень ад'езду каго-небудзь з родных ёсць своеасаблівым сямейна-родавым абярэгам. Да такіх, дарэчы, адносяцца амаль усе гаспадарчыя прадметы — нож, печ, венік і гэтак далей.

Да аказіяльных абярэгаў аўтары сайта далучаюць тыя, якія кудысьці носяць ці камусьці перадаюць. Цікавы прыклад з зямлёй. „Родная зямля, — распавядаюць «супрацоўнікі» віртуальнага музея, — узятая чалавекам з сабой на чужыну, адыгрывала ролю абярэга, пасля ягонай смерці яе клалі ў магілу.

Каб хлопец адслужыў у войску і вярнуўся дадому жывым і здаровым, у час яго провадаў у войска выконвалася наступнае дзеянне: правай босай нагой хлопец пакідаў на зямлі каля парога выразны адбітак, маці збірала зямлю са следам у чыстую хусціну, завязвала на два вузлы і несла ў хату, каб захоўваць у чырвоным куце ўвесь тэрмін вайсковай службы".

Сярод старонак сайта — слоўнік тэрмінаў і спіс святаў. Ён досыць поўны і дае адказы на многія пытанні. Між тым стваральнікі музея не лічаць, што іхняя праца скончана і запрашаюць да супрацоўніцтва ўсіх, каму неабыякавая культурная спадчына беларускага народа.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Ну і навіна — з трох адна!

Хакей у Беларусі — найбольш прыярытэтны і адпаведна развіты гульнёвы від спорту. Лагічна ў першым нумары 2007 года пагаварыць менавіта пра навіны і асаблівасці хакейнага сезона, які цяпер у самым разгары.

На зломе двух гадоў у Швецыі праходзіць моладзевы чэмпіянат свету, у якім бяруць удзел маладыя майстры клюшкі ва ўзросце да дваццаці гадоў. Беларусы на ім стартавалі з сенсацыйнай перамогі над Фінляндыяй — 4:3. Пасля двух перыядаў нашы саступалі, але ў заключнай траціне матчу выявілі валявыя якасці і перамаглі. А між іншым, суомі былі бронзавымі прызёрамі папярэдняга першынства. Шкада, але здзейсніць пераможную серыю не ўдалося. У другім спатканні выхаванцы трэнерскага тандэма Эдуард Занкавец — Уладзімір Цыплакоў прайгралі швейцарскім равеснікам — 1:4. Дадам, што ў адной групе з беларусамі выступаюць таксама Чэхія і Расія. Матчы з імі пакажуць, на што здольная айчынная моладзевая дружына на гэтым планетарным турніры, удзел у якім бяруць 10 мацнейшых зборных.

Громам сярод, здавалася, бясхмарнага неба прагучала заява міністра ўнутраных спраў Беларусі і, па сумяшчэнні, старшыні нацыянальнай хакейнай федэрацыі пра тое, што ў наступным сезоне ў Мінску з трох існых будзе створана толькі адна каманда. Сённяшнія „Юнацтва", „Дынама" і „Керамін" будуць зліквідаваны, а ў сталіцы паўстане новы клуб-сімбіёз. Галоўная мэта новага праекта (ці ўсё ж пражэкта?) — удзел беларускай каманды ў вышэйшай лізе чэмпіянату Расіі (гэта не мацнейшы хакейны дывізіён усходняй суседкі, вышэй стаіць расійская суперліга). Плюсы такога ўдзелу пакуль прывідныя, а вось мінусы відавочныя. Па-першае, зразумела, што ніхто не лічыўся ні з інтарэсамі згаданых каманд, гісторыя якіх скончыцца, ні з сімпатыямі іх заўзятараў. Па-другое, нацыянальны чэмпіянат Беларусі страціць галоўную інтрыгу — хоць новы суперклуб будзе паралельна выступаць у родным першынстве — на роўных з ім канкураваць ніхто не зможа. Дарэчы, у бягучым розыгрышы змаганне ідзе на рэдкасць упартае і непрадказальнае — менавіта „Юнацтва", „Дынама" і „Керамін" па чарзе змяняюць адзін аднаго на чале пелетону чэмпіянату.

Выдатна гуляе за омскі „Авангард" у расійскай суперлізе беларускі форвард Аляксей Калюжны. Ён па-ранейшаму ідзе другім у спісе бамбардыраў і, як сапраўдны лідэр, цягне сваю каманду на самую вяршыню турнірнай табліцы.

Напрыканцы крыху пра справы нашых заакіянскіх легіянераў. У НХЛ па-ранейшаму выступае толькі Руслан Салей. Адзін з ветэранаў мацнейшай лігі свету ў сваім новым клубе „Фларыда Пантэрз" праводзіць вельмі добры сезон. Так Салей ужо ўсталяваў новы асабісты рэкорд выніковасці ў рэгулярным чэмпіянаце — 23 ачкі (5 галоў плюс 18 перадачаў). З іншага боку, „Фларыда" ідзе апошняй у сваім дывізіёне і амаль безнадзейна адстае ад зоны плэй-оф. Іншыя нашы „ландскнехты" праходзяць далейшую практыку ў ніжэйшай лізе — АХЛ. Андрэй Касціцын, Міхаіл Грабоўскі і Канстанцін Захараў выбіцца наверх з фарм-клубаў пакуль не ў змозе. Затое да чэмпіянату свету ўсе нашы заакіянскія прадстаўнікі могуць вызваліцца.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Памяткі з Дубна

У ліпені і жніўні 2006 года на палях вёскі Дубна, што ў Боцькаўскай гміне, археолагі з Польшчы і Беларусі праводзілі раскопкі ў месцы колішняга двара роду Сапегаў. Пра пачатак прац паведамлялася ў „Ніве" ад 3 верасня мінулага года. Пра вынікі раскопак спытаў я спадарыню Галіну Карвоўскую з Археалагічнай майстэрні Падляшскага музея.

У 2006 годзе было выкапана 18 шурфаў у трох месцазборах. Раскопкі праводзіліся ў месцах, дзе паводле захаванага інвентара ад 24 чэрвеня 1655 года былі тры аб'екты: старая і новая камяніца ды гаспадарчыя збудаванні.

На месцы старой камяніцы раскапаны рэлікты планіроўкі ў выглядзе фундаментаў, выкананых з цэглаў, змацаваных вапнай. Падмурак сягаў глыбіні 2,5 метра. Раскапаны фрагменты памяшканняў з цаглянай падлогай. Праўдападобна будынак стаяў на плане літары L; мяркуецца, што быў ён узведзены на схіле 16-га стагоддзя. З гэтага месца было сабрана шмат керамічнага матэрыялу, у тым ліку амаль увесь камплект пячной кафлі.

На месцы новай камяніцы былі раскрыты фрагменты склепавых фундаментаў з камянёў, змацаваных вапнай з дадаткам цаглянага друзу. Мяркуецца, што новая камяніца была ўзведзена ў 18-м стагоддзі.

На месцы гаспадарчых збудаванняў знойдзены драўняныя рэшткі, праўдападобна ад падрубаў.

Усяго знойдзена каля трох тысяч памятак. Большасць з іх, гэта рэшткі керамічнай пасуды, ёсць шмат рэштак пячной кафлі, абломкі шкла, асабліва ліставога, аконнага, фрагменты будаўнічай керамікі, рэшткі жывёльных касцей і каля пяцідзесяці іншых знаходак (жалезныя цвікі, дзве гліняныя гіркі, фрагменты дзвярных або аконных аковак).

Як у даследаваным двары выглядала штодзённае жыццё, пакуль што складана меркаваць. Пра гэта можна будзе гаварыць, калі будзе магчымасць больш шырока супаставіць знойдзеныя памяткі з колішнімі інвентарамі. Двор займаў вялікую прастору, паасобныя аб'екты былі ад сябе аддалены на нейкія 200-300 метраў. Неабходныя будуць геамарфалагічная і гістарычная апрацоўкі гэтай тэмы. Вясной прадбачваецца кніжнае падвядзенне вынікаў цяперашніх даследаванняў дварышча ў Дубне з выкарыстаннем гістарычных фондаў, захаваных у Польшчы і Беларусі. Знойдзены гістарычны матэрыял пасля апрацоўкі будзе паказаны на часовых выставах, найперш у Боцьках, затым у Бельску і Беластоку. Падляшскі музей будзе хадайнічаць за далейшымі сродкамі для даследавання дварышча ў Дубне, бо гэты аб'ект варт такіх захадаў.

Плітка кафлі з Дубна, датаваная на 16-17 стст.

На нашай тэрыторыі праводзіцца нямнога раскопак. У палявы сезон 2005 года стацыянарныя раскопкі адбываліся на раннесярэдневяковым гарадзішчы ў Трасцянцы, што ў Янаўскай гміне, ды ў месцах будаўнічых прац з прадбачванымі землянымі работамі: каля Палаца Браніцкіх у Беластоку па даручэнню Гарадской управы ў сувязі з планамі аднаўлення некаторых элементаў палацавага атачэння, у раёне беластоцкага амфітэатра ў сувязі з раскопкамі для пабудовы Падляшскай оперы і па даручэнню Дырэкцыі краёвых дарог на неалітычным паселішчы ў Сахонях, на месцы будучай кальцавой дарогі вакол Васількава.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Эскарыял са снегам ды Таледа з неба

Кафедра ў Таледа

Які холад! Прыехаў я ў Іспанію, каб уцячы ад зімы, а тут... І яшчэ пачынае падаць снег. Але што ж, нічога дзіўнага: я ж у гарах.

Пятніца, 8 снежня 2006 г. Чыгуначны вакзал у прымадрыдскім горадзе-спадарожніку Эскарыял. Горад знаходзіцца 50 кіламетраў на поўнач ад сталіцы Іспаніі, на вышыні каля тысячы метраў, у самым сэрцы Сьера-дэ-Гвадарама.

На шчасце пасля пяці хвілін перастае падаць снег і можам ісці ў турпаход. Гэтым разам памяняў я кубінскае таварыства на „больш прыгожае". Маім экскурсаводам з'яўляецца Крыстына — студэнтка II курса гісторыі Аўтаномнага універсітэта Мадрыда. Галоўная мэта нашага падарожжа гэта палацава-манастырскі ансамбль (Monasterio de San Lorenzo de Escorial). Паводле расказу Крыстыны, іспанскі кароль з Габсбургскай дынастыі Філіп II, які быў вельмі рэлігійны, рашыў пабудаваць манастыр, каб падзякаваць Богу за ўсе атрыманыя поспехі ды ўвекавечыць памяць ягонага роду на наступныя стагоддзі. Традыцыя гаворыць, што падчас змаганняў з англічанамі пад Сан-Кінцін (Францыя) выпадкова разбураны быў касцёл св. Лаўрэнція і таму Філіп II рашыў прысвяціць яму новую будоўлю. Работы пачаліся ў 1563 годзе, а закончыліся ў 1584 годзе.

— Але найбольш цікавае тое, — тлумачыць мая сяброўка, — што манастыр мае кшталт прылады, пры дапамозе якой быў замучаны св. Лаўрэнцій, а менавіта каласніковай краты.

Урэшце, пасля 30 хвілін маршу, нашым вачам паказваецца велізарны будынак — манастыр св. Лаўрэнція, пабудаваны побач гары Монтэ-Абантос (1 028 метраў). Даўжыня яго фасаду складае 207 метраў, у ім 86 лесвіц, 9 вежаў, 1 200 дзвярэй ды 2 673 акон. Усярэдзіне вісяць карціны такіх мастакоў як Дзюрэр, Эль Боска ды іншых.

Манастыр гэта не толькі пакоі, вялікая бібліятэка ды базіліка, над уваходам якой стаяць старазапаветныя фігуры яўрэйскіх цароў.

— Цікава ці сустрэнем Філіпа II? — смяецца Крыстына.

Паводле легенды дух караля час ад часу вандруе па манастырскіх памяшканнях. Варта адзначыць, што амаль усе каралі, якія панавалі пасля Філіпа II, пахаваныя якраз у манастыры св. Лаўрэнція.

Паводле падання, частка карцін, якія захоўваюцца ў гэтым ансамблі, намаляваў Эль Грэка, але палотны і іх аўтар не спадабаліся каралю, таму былі яны замаляваны, а сам мастак выехаў у Таледа.

Сёння Эскарыял гэта малое мястэчка з вялікай колькасцю турыстаў, якія прыязджаюць сюды наведаць славуты манастыр.

— Праз тыдзень у Таледа стомімся намнога мацней, — гаворыць мая сяброўка.

Дарэчы, тыдзень пазней, у суботу, сядзім у цягніку з Мадрыда ў Таледа. Горад — колішняя сталіца вестгоцкага каралеўства — у адрозненні ад Эскарыяла больш аддалены ад сталіцы (ляжыць каля 100 кіламетраў на поўдзень ад Мадрыда) і больш шматлюдны (налічвае каля 100 тысяч жыхароў).

— Тут пабачым намнога больш цікавага, чым у Эскарыяле, — гаворыць Крыстына, сыходзячы з цягніка.

Горад заснаваны быў ібэрамі, пасля трапіў пад панаванне Рыма. Але найбольшае значэнне ў якасці палітычнага ды культурнага цэнтра набыў ён у межах візігоцкай дзяржавы. Помнікам-сімвалам Таледа з'яўляецца Алькасар, пабудаваны яшчэ ў XI стагоддзі. Будынак шмат разоў разбураўся і аднаўляўся. У 1936 годзе ў час грамадзянскай вайны ў ягоных сценах бараніліся прыхільнікі генерала Франка.

Манастыр св. Лаўрэнція ў Эскарыяле

Менавіта першым месцам, якое наведваем у Таледа, з'яўляецца Алькасар, а пасля яго — кафедра: адна з найбольш знакамітых будоўляў іспанскай готыкі. Узведзена яна была ў 1227-1493 гадах. Характэрная рыса кафедры — паўднёвая вежа, якая не была ў свой час закончана і пазней завершаная барочным купалам. Паўночная вежа дасягае 90 метраў.

У паўднёвым сонцы храм прэзентуецца непаўторна. Усярэдзіне, у адной з каплічак, якраз адбываецца цырымонія шлюбу. Хаця цяпер вялікую частку (калі не большасць) іспанцаў складаюць няверуючыя, аднак не адмаўляюцца яны ад касцельных шлюбаў. Сябра растлумачыў мне, што гэты феномен выкліканы тым, што касцельная цырымонія вельмі прыгожая.

Хаця Таледа не знаходзіцца яшчэ ў гарах, аднак ягоная ўзгорыстая тэрыторыя крышку стамляе наведвальнікаў горада. Вялікае ўражанне выклікаюць вузкія вулачкі і старыя камяніцы.

— Можа купім зброю? — пытаюся жартам. Дарэчы, пры кожнай вуліцы, на кожным пляцы знаходзяцца крамы з копіямі старой зброі. Гэта не толькі спосаб зарабіць на турыстах, але і своеасаблівае працягванне традыцыі, паколькі ў мінулым Таледа славілася між іншым вырабам зброі.

Побач узбраення прадаюцца фігуркі Дон Кіхота. Менавіта па гэтым рэгіёне вандраваў герой кніжкі Сервантэса.

Доказам гістарычнай шматкультурнасці Іспаніі з'яўляецца той факт, што па чарзе наведваем касцёл, мячэць ды сінагогу. На гэтых землях пражывалі не толькі хрысціяне, але і мусульмане ды сефардыйскія яўрэі. Хлуснёй было б, калі б я сказаў, што ў краіне, каралі якой былі ярымі каталікамі, канфесійнае сужыццё пазбаўленае было канфліктаў ды пераследаў.

Апошнім пунктам нашага (даволі стамляльнага) падарожжа быў касцёл езуітаў. Не ведаю ўжо колькі храмаў бачылі мы сёння... Адно ў гэтым апошнім непаўторнае: можна ўвайсці на вежу і (як напісана ў даведніку), „паглядзець на Таледа з неба".

І гэтым нябесным акцэнтам закончылася наша падарожжа ў Таледа. Яшчэ толькі паўгадзіны ў цягніку (так, тут цягнікі дыстанцыю 100 кіламетраў пераадольваюць у няцэлыя паўгадзіны) і пасля вяртання зноў станем рыхтавацца да новага падарожжа. Неўзабаве.

Тэкст і фота Міхася СЦЕПАНЮКА

Міністры ў царкве

Не ведаю як іншыя, але маю прыхадскую царкву ў Сямятычах апрача звычайных, шэрых прыхаджан, наведваюць незвычайныя людзі, мабыць, нейкія паслы, а можа нават міністры. А я, цёмны мужык, да нядаўна нават не ведаў, што кожны тыдзень аціраюся каля „лепшай кампаніі". Аднак у мінулую нядзелю лёс мяне ўсвядоміў і адбылося гэта тады, калі адчуў я сябе дрэнна (сэрца!) і ў пачатку багаслужбы вымушаны быў выйсці з царквы і ўсю літургію прастаяць пад дзвярыма, на вольным паветры. І тады спасцігла мяне азарэнне: спярша выйшла ЯНА — даволі спешна выцягваючы з сумкі звонкі мабільнік. Размова, відаць, была важная, бо панечка 10 хвілін прахаджвалася вакол царквы з апаратам каля вуха. Праз нейкі час таксама спешна выскачыў з царквы ЁН, паглядзеў на нумар бачны на экране мабільніка і неадкладна пачаў размову. А пасля яшчэ дзве іншыя асобы ў падобны спосаб пакінулі на нейкі час Ісуса Хрыста, бо атрымалі важныя тэлефанаванні. Нясмела здагадваюся, што ўсе яны вельмі важныя асобы і, мабыць, тэлефанаваў ім сам прэзідэнт або прэм'ер-міністр дзеля кансультацыі. Толькі чаму яны заўпарціліся тэлефанаваць у наш прыход?

У найбольшай ступені модзе падвяргаюцца неразумныя, бесхарактэрныя людзі. Такіх найлягчэй выдрэсіраваць, унушыць ім штосьці, прымусіць да нечага. Цяпер пайшла мода на мабільныя тэлефоны і пэўна з імі ўжо нават і ў прыбіральню ходзяць. Сам я быў сведкам як адзін чалавек, які нядаўна разбагацеў, тэлефанаваў з салона на кухню (на адлегласць 10-15 м), каб папрасіць цешчу падысці да стала. Відаць, хацеў зрабіць уражанне, але я ўспрыняў гэта як звычайнае хамства!

Цікава, якая мода запануе сярод ідыётаў, калі знудзяцца мабільнікі? А можа модным стане карыстацца сваім розумам? Але хіба не ў нас.

М. Ц.

50 гадоў разам

У ЗАГСе ў Белавежы (Гайнаўскі павет) адбылася прыемная ўрачыстасць: чатыры пары атрымалі медалі „За шматгадовае шлюбнае жыццё", прысвоеныя ім прэзідэнтам РП Лехам Качынскім. Дастойныя юбіляры гэта: Барыс і Валянціна Дацкевічы, Ян і Анна Янюкі, Баляслаў і Ніна Кучкі ды Станіслаў і Ядвіга Саўрыцкія. Усе яны бралі шлюб у 1956 годзе і пражылі з сабой паўвека.

Для ўзнагароджаных пар былі адпаведныя акалічнасці торт, шампанскае, букеты кветак ды пажаданні здароўя і многіх гадоў жыцця. З мастацкай часткай выступілі вучні мясцовага Комплексу лясных школ пад кіраўніцтвам Крыстыны Дацкевіч.

(мох)

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 2 000 egz.

Суседскія былі

АЎТАМАРА

Лявон Місюкевіч праз усё жыццё выношваў толькі адну мару. Ён хацеў мець свой аўтамабіль. Можа быць нават без тармазоў, без руля і сядзення. Абы ехаў. Нават, проста, абы быў. Так хацеў машыну, аж млеў. А дзе ж у тыя часы „развітага савецкага сацыялізму", жывучы ў перадавым калгасе, можна было дастаць легкавік, калі нават гумовыя боты былі дэфіцытам і прадаваліся толькі па талонах, з папярэдніх спісаў, пры ўмове наяўнасці пакупніка ў жывой чарзе і толькі адна пара ў рукі, прытым не часцей чым раз на тры гады, без права замены на іншыя. І нават, выканаўшы ўсе гэтыя ўмовы, боты, як і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, створаныя рукамі рабочых і сялян самай багатай краіны свету, можна было набыць толькі па вялікім блаце.

Для таго, каб без чаргі, гэтак у гадоў дваццаць пяць — трыццаць сем набыць легкавік, вялікага блату ўжо не хапала. Патрэбна было сяброўства ў КПСС, чыстая і прыгожая біяграфія, бацькі партызаны, радня — як мінімум спачуваючыя партызанам і граматы ды іншыя ўзнагароды з месца працы. У дадатак да гэтага трэба было мець некалькі дзесяткаў гадоў працоўнага стажу і заставацца прытым маладым перспектыўным спецыялістам гадоў дваццаці трох.

З усяго неабходнага для набытку сваёй машыны ў Лявона былі толькі грошы. Усе іншыя патрэбныя катэгорыі не вытрымлівалі аніякай крытыкі. КПСС Місюкевічы ніколі не любілі, і, каб Лявон туды ўляпаўся, як у тое, што смярдзіць, то ўся радня яго зраклася б. Біяграфія таксама абы-што. Перад магутнай айчынай давялося яму выканаць толькі пачэсны добраахвотны абавязак службы ў савецкім войску. І то пад прымусам. Бацька нібыта быў у партызанах, але хіба не ў тых, якія змагаліся за савецкую ўладу. Але як іхны сваяк сельсавет узначаліў, удалося, дзякуй Богу, усе паперы падрабіць. Нават медаль за вызваленне Будапешта прыпісалі. Ды афішаваць новае гераічнае мінулае не было варта, а то хтосьці з зайздрасці ці па п'янцы данясе як гэта стары Місюкевіч камісараў ганяў па лясах і тлумач пасля чаму той Будапешт так доўга штурмавалі. Радня таксама не з лаяльных да бальшавікоў, ды і з працы адны нараканні. Ну а стаць маладым спецыялістам і мець пры гэтым вялікі працоўны стаж няшчасны раб аўтамабільнай мары і не спрабаваў. Не ўяўляў як так можа быць. Нейкая вышэйшая навука не для сярэдняга інтэлекту.

Так і загібеў бы Лявон з адчаю, каб не маладзенькая дачка старшыні мясцовага выканкама. Падарыў ёй бацька на дзень нараджэння „Запарожца", дваццаць гадоў любімай дачцэ споўнілася. Набыў ён тую машыну па лініі дапамогі пакалечаным ветэранам другой сусветнай вайны, якія ўжо на пенсіі. Начальства ўсё можа. А дачка ў першы ж дзень адляцела на той машыне ад слупа як мячык, і ў другі слуп. Пасля палічыла тым, што засталося ад „Запарожца", усе стаякі моста праз мясцовую рачулку, зрабіла на мосце трайное сальта з двайным бакавым пераваротам, рэзнулася ў трактар і зляцела ў раку. Ёй то нічога. Бацька начальнік, таму дактары паднялі яе на ногі хутка. Праз год і сем месяцаў. А вось з машынай праблемы. Увесь гэты час „Запарожац" прымаў рачныя ванны. Успомніў пра яго мясцовы начальнік толькі тады, калі яго дачка зноў стала патрабаваць у бацькі лепшую машыну, спісаўшы няўдачу ў пераездзе моста на тое, што „Запарожац" гэта не машына, а чалавек, які жыве на Украіне. Бацька пастараўся ёй растлумачыць, што „Масквіч" таксама можа быць чалавекам, але пасля вінавачанняў з боку жонкі, што родная дачка абдзеленая і няшчасная з такім бацькам, здаўся. Паўстала пытанне што рабіць з „Запарожцам", бо дзве машыны ў тыя часы нельга было мець нават дачцэ сябра КПСС.

Вось тады і ўспомнілі пра Місюкевіча. Вырашылі тую дабітую развалюху на яго перапісаць. А той і рады. Нарэшце здзейснілася яго мара. Узяў сякеру, малаток, параўняў усё, што мог параўняць сваім няхітрым інструментам. З рухавіком дапамог сусед, калгасны спец па рамонтах. Недзе ўдалося сцягнуць акумулятар ад самазвала і праз нейкі месяц Лявон першы раз у жыцці выехаў са свайго падворка на машыне. На посце ДАІ яго хацеў спыніць знаёмы міліцыянт. Можа закурыць хацеў папрасіць, а можа так чаго. Але сістэма тармазоў ніяк не рэагавала на панічныя націсканні Лявона на педаль.

— Стой! — крычыць міліцыянт. — Заб'ешся, дурань! Адчыняй дзверы ды выскаквай.

— Не магу! — з жахам у вачах раве няшчасны шафёр. — Дрот не развязваецца!

Міліцыянт, які хапіўшыся за люстэрка ляцеў за „Запарожцам", глянуў у сярэдзіну машыны і аслупянеў. Дзверкі, хіба з тае прычыны, што не працавалі замкі, былі счэпленыя дротам, які прама на сваім пупе нервова стараўся разблытаць Місюкевіч. І як толькі яму гэта ўдалося, абедзве дзверкі адваліліся ад машыны ў розныя бакі, як гарох ад сцяны, і, ляснуўшыся аб дарогу, працягвалі даганяць сваю машыну па законах інерцыі. Шлях да ўратавання шафёра быў адчынены, прытым з двух бакоў. Але шафёр не паспеў выскачыць. Акурат у гэты момант дарожнае скрыжаванне пераязджала на новенькім „Масквічы" ранейшая ўладальніца „Запарожца". Яе былая маёмасць рэзнула ў новую ўласнасць прама па сярэдзіне, спіхнула яе ў роў і абедзве машыны пакаціліся ўніз, таўкучы і ломячы адна другую.

Пашанцавала, што кіроўцы на гэты раз не пацярпелі. Дачка мясцовага начальніка лётае ля гары разбітага металу, як вар'ятка, што аб'елася канапель, а ўладальнік яе былой маёмасці сядзіць на гэтай грудзе ламачча і курыць.

— Віншую цябе, Лявон, — схіліўся над яго вухам міліцыянт, які добра ведаў гісторыю набыцця Місюкевічам „Запарожца". — Цяпер, хіба, бацька той дурніцы купіць ёй „Волгу", а табе, як ветэрану бітвы з мангола-татарамі, дастанецца яе „Масквіч". Шмат лепшая машына, чым твой „Запарожац".

І тут Лявон зароў як паранены ракетай бык:

— Не хачу машыны! Ніякай не хачу! Хачу каня.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка



1. абласны горад між Кіевам і Гомелем, 2. частка конскай вупражы, што пад дугою, 3. карэйская грашовая адзінка, 4. восьмая планета сонечнай сістэмы або рымскі бог мора, 5. будаўнічы матэрыял з сумесі цэменту і вады, 6. сын Аўраама і Сары, 7. галоўны горад кітайскіх уйгураў, 8. птушка сямейства крумкачовых з бела-чорным апярэннем, што на хвасце прыносіць навіны, 9. месца, дзе захаваліся рэшткі старажытнага горада.

(ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 48 нумара

Ааху, асёл, атава, веладром, вецер, вока, Гайнаўка, гук, Дзева, мох, мядзведзь, нож, Обаль, сені, стакан, тыраж, цар, чын.

Рашэнне: **Свет нагадвае музей, дзе кожны чалавек можа сыграць адну з трох роляў: мастака, наведвальніка або вахцёра.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** з Беластока і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

07.01 – 13.01

Баран (22.03. — 20.04.) Будзеш непахісны, моцны, зможаш вырашыць ключавыя пытанні свайго жыцця. Добры час на размовы ў справе працы. 7-10.01. тактычнасць і поспехі ў перамовах.

Бык (21.04. — 21.05.) Могуць паявіцца нечаканыя грошы. Можа вярнуцца даўняе каханне не толькі ва ўспамінах. З 10.01. будзе цябе аж распіраць вялікая радасць, аптымізм. Прыцягваеш грошы як магніт!

Блізняты (22.05. — 21.06.) Будзеш рашучы на працы, менш у пачуццях. Хоць вельмі шмат часу прысвяціш партнёру і яго задавальненню. Хочацца быць з кімсьці назаўжды, ды не хочацца траціць свабоды.

Рак (22.06. — 23.07.) Зробіш усё, каб твой абраннік адчуваў сябе каханым, шчаслівым, каштоўным для цябе. Затое не раскідвайся грашом. Хоць можа раптам фартуна шчодра сыпануць табе ў кашалёк. Пільнуй сваё горла і бронхі.

Леў (24.07. — 23.08.) Знакамітыя ідэі, на якіх можаш зарабіць столькі, што і не спадзяешся. Усмешка не зыдзе з твайго твару (увесь месяц!). Можаш паспяхова сесці на дыету.

Дзева (24.08. — 23.09.) Трымай язык за зубамі, каб не знеахвоціць да сябе людзей, асабліва гэтых, на якіх табе залежыць. Можаш зрабіць у сваім жыцці малую рэвалюцыю. Не раздумвай пра грошы, тады самі яны знойдуцца.

Шалі (24.09. — 23.10.) Пільна разглядайся — вялікія пачуцці могуць з'явіцца ніадкуль. Трымай таксама руку на пульсе інвестыцый; маеш шанц на немалы заробак. З 10.01. спрыяе табе Венера!

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Жарсці выбухнуць з вялікай сілай. У прафесійных справах — творчы размах і наватарства. Пераканаешся, што ўява ідзе сваёй дарогай, а жыццё можа пайсці сваёй; давярай лёсу. Шчасце табе спрыяе ўвесь месяц, калі нават у яго не верыш!

Стралец (23.11. — 22.12.) З 10.01. поспехі на працы; шчасце спрыяе і ў дробных, і ў вялікіх справах. Урэшце сустрэнеш асобу, па якой даўно тужыў. А на рахунку прыбывае...

Казярог (23.12. — 20.01.) Можаш дабіцца вялікага поспеху ў бізнесе, на працы, у пошуках занятку. Каханне можа закінуць на цябе сіло, і не ўцячэш! Адкрытасць на свет, сімпатыя атачэння. Мужчына Казярог захопіць любую даму.

Вадалей (21.01. — 19.02.) У галаву заляціць шмат ідэй, якія можна ажыццявіць. Поспехі дзякуючы самому сабе і сябрам. Шчасце амаль на кожным кроку. Ды 9-13.01. зважай на ашуканцаў і маніпулятараў сярод супрацоўнікаў; трымай „вочы вакол галавы"!

Рыбы (20.02. — 21.03.) З 11.01. могуць паявіцца праблемы на працы; не запірайся пры сваёй рацыі і не бярыся за ідэі, якім пагражае правал. Зважай на інтрыганаў! Дай больш свабоды партнёру ды больш яму давярай. Перачакай магчымы крызіс у пары.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Сяргей Пліс- II

Ніва
ПРА МІНУЛАЕ

„Рады для эмігрантоў” - III

ГАГАТУХА Ў ПЛЁСКАХ

Прачнулася я пазнавата. На дварэ завея, гурбы снегу. Шыбы памаляваў мароз. Я прыліпла носам да шыбіны, узіраюся. Бацька ідзе ў палоўнік, у руцэ трымае лапату, адгартаў быў снег — рабіў сцежкі да хлява, клуні і на вуліцу. На вуліцы снег таксама трэба было адкінуць, інакш шыткі ўстрагнуць у змятах, як тыдзень таму.

На дварэ мароз, снег, а ў хаце цёпленька, ды з кухні ляцяць прыемныя пахі — ага, маці пячэ кішкі, сёння ж гагатуха. Не можа быць гагатухі без печаных кішак! Каўбасу будзем есці заўтра, у Новы год, а сёння вечарам — смачныя кішачкі напханыя цёртай картопляй ды яшчэ з грачанай мукою. Якое смакоцце! Калісьці, як расказвала мама, у такі вечар прыходзіла моладзь пад вокны і крычала: „Гу-гу-гу — дайце таго, што на рагу!”, значыць, каўбаску ці кішку, і давалі.

— Ніна, уставай, дакуль ты будзеш спаць, сняданак трэба есці, — крыкнула маці, адчыняючы дзверы ад кухні. Хутка нацягваю кабат і іду на кухню. Кішкі пахнуць у печы, старэйшая сястра замясіла ўжо цеста, няхай падыходзіць — дастануць кішкі, усадзяць у печ палюшкі з макам і яблыкамі. У хату ўваходзіць бацька, кажа: „Ну, зрабіў ужо сцежкі, а то да суседзяў не было як зайсці”. Здымае шапку-аблавушку, кажух, вялікія цёплыя рукавіцы ды сядае за стол. Другая сястра кідае кручок ды пражу (рабіла шалік) і злазіць з печы. Усе сядаем за сталом, толькі бабуля аддзельна, пры печцы, у яе ўжо няма зубоў, есць памаленьку, не хоча з намі.

На стале ўжо стаіць міска з мясам (на Руздво закалолі парсюка), нарэзаны скібкі хлеба. Кожны бярэ ў руку кавалачак хлеба, а бацька пытаецца: „Маці, а бабулі аставіла?” — „А як жа, аставіла!”

Сястра Манька выбірае ўсё тлустыя кавалачкі, а я толькі худзенькія. Потым маці ставіць грачаную зацірку з малаком. Якая смачная! Масла ды сыры рэдка ў нас бывалі — сям’я любіла малако і малочныя стравы. Затое грэчкі было шмат — елі мы грачанікі, кашу, зацірку... Хапала! Пасля сняданку мама занялася мыццём посуду, бацька прылёг на ложак адпачываць, бабуля палезла на запік, сёстры кудысьці пабеглі, а я ўзялася за маляванне. Сяджу за сталом, малюю ружы — вельмі ж люблю маляваць. Гляджу ў акно — ідзе суседка.

— Мама, ідзе да нас цётка Параска, — перарвала я цішыню.

— Добра, добра, а то няма рот да каго адкрыць.

Параска ўваходзіць у хату, вітаецца, сядае на табурэтку ў кутку ды давай з мамай пляткарыць. А я малюю ды ўслухаюся.

— А дзе ж твае дочкі, Олько?

— Ано, пабеглі да дзяўчат варажыць. Для маладых сёння вельмі важны дзень. Помніш, Параско, мо і табе я расказвала, як сама варажыла? Было гэта, праўда, не на гагатуху, а на святога Андрэя. Было мне тады 16 гадоў. Познім вечарам, калі мама спала, узяла я жменю льну і пайшла да калодзежа, з якога ніколі не брала вады. Калодзежы ў нас на Мацейках былі толькі два, пры самай вуліцы, каб усе маглі браць ваду. Я прыйшла і стала сыпаць лён на ваду і прыгаворваць: „Андрэю, Андрэю, я на табе лён сею, хто мае быці мне, прыйдзі ва сне”. Потым адвярнулася назад — барані Божа, нельга аглянуцца! — давай бегчы колькі сілы ў нагах дахаты. Увайшла ціхенька і хутка лягла ў пасцель, каб мама не прачнулася і не загаварыла да мяне — мне ж нельга было азывацца!

Максім і Ольга Бручко з дачушкамі Манькай і Надзяй

— Ну і што, прысніўся табе хто? — пацікавілася Параска.

— А як жа ж! Прыснілася мне, што пры калодзежы ля Дарасіды стаіць грамада хлопцаў. І тут адзін з іх хуткім крокам накіроўваецца да мяне. І гэта быў мой Максім! Устала я раненька і думаю: як жа гэта, не можа быць, ён жа з чужой вёскі, старэйшы за мяне, мала я яго ведаю, да таго цяпер жа ён у арміі. Ну і як жа, Параско, не верыць у варожбы!

— Так, так, як тут не верыць. Ага, засядзелася я, пайду дамоў, а хто ведае, мо якую нявестку хлопцы „прыцягнуць” вечарам. Трэба падрыхтавацца, угасціць жа ж трэба абавязкова!

Надыходзіў вечар, дзяўчаты пачалі варажыць. Прыбегла да маіх сясцёр і суседка Насця. Прывялі ў кухню нашага сабаку, паклалі тры купкі ежы і пусцілі цюцьку: якую будзе есці першую? З’еў Надзіну, потым Маньчыну, а Насціну пакінуў! Значыць, замуж першая пойдзе Надзя, потым — Манька, а Насця застанецца ў дзеўках (і ведаеце, так яно і было!). Зараз прыбегла яшчэ і Лідка. Дзяўчаты выбеглі на панадворак, сталі скідаць з ног часанкі і кідаць іх за сябе, над галавой. У які бок упадзе валёнак наскам — значыць, у тым напрамку ўласніца пойдзе замуж. Я ўжо не бачыла, як падалі тыя часанкі, толькі Манька ўбегла ў хату з крыкам: „Насцін часанак упаў у калодзеж, давайце басак, трэба выцягнуць яго з вады!”

Я таксама пабегла да сяброўкі Мані: „Давай, і мы будзем варажыць, лічыць астраколы: «пара — не пара», або пісаць на картачках імёны хлопцаў — каго выцягнем з-пад падушкі? А мо пойдзем пад акно суседа і пакрычым: «Дайце знаць, як майго мужа зваць!» Так навучыла мяне сястра Надзя, якая калісь бегала з сяброўкай пад суседскія вокны. Надзя казала, што найгорш, калі гаспадыня адкажа «Пракоп!» або «Міфодзій!». Тады злосныя дзеўкі беглі пад іншыя вокны, можа, там адкажуць: «Пеця», «Валодзя» або «Вася», звычайна, а не якісьці «Пракоп»”!

Калі наступаў вечар, дзяўчаты сядзелі дома, нікуды не выходзілі, а то хлопцы схопяць ды „зацягнуць” да нарачонага ў хату. Будзе сорамна перад бацькамі! За Лідкай, старэйшай сястрой Мані, прыйшлі яшчэ завідна. Яна ўлезла на печ, хапіла валок і давай ім махаць ва ўсе бакі. А мы з Маняй узіраемся: возьмуць яе, ці не возьмуць? Удалося абараніцца. Не „зацягнулі” яе да нарачонага Алёшкі. Столькі шчасця не мела Надзя, якую „зацягнулі” ў хату да Фіяфана. Стаім мы з Маняй пад акном, узіраемся. Хлопцы паслалі кажух на стульцы, пасадзілі Надзю, потым адчынілі печ і паказалі кацюбу. Фіяфан паставіў на стол бутэльку, а цётка Параска закуску. Папілі, пасмяяліся ды разышліся. Мы з Маняй таксама пабеглі дамоў — было ўжо пазнавата. А ноч была месячная, зоркі залётна падміргвалі на марозным небе. Любата! Я яшчэ не заснула, як ізноў раздаўся крык. Гэта крычала не ў свае сілы Верка з канца вёскі, нарачоная Колі, нашага суседа. Была яна амаль голая і босая! Відаць, схапілі яе проста з хаты, не далі і апрануцца!

Мая сястра Маня мела таксама нарачонага, Кудзю. Яшчэ было відна на дварэ, як яна залезла на печ і ціхенька сядзела. Сказала бацьку заперці дзверы. Хлопцы доўга стаялі на марозе. Не пашанцавала ім вечарам, дык схапілі дзяўчыну, як ішла на ўсяночную. Дапільнавалі! А сястра Надзя з сяброўкай Зінкай дагаварыліся былі аднолькава паваражыць. Наелася Надзя сялёдкі, шклянку вады паставіла ля пасцелі, пад падушку паклала бацькавы нагавіцы і пайшла спаць, да нікога не азваўшыся. „Хто прысніцца і дасць вады напіцца?” Заснула. І сніцца ёй сон: ідуць абедзве з Зінкай у адзін бок, да моста. Бачыць: на калочку вісіць вайсковая шапка. Падыходзіць Надзя, бярэ тую шапку, а ў той момант Зінка ляціць у проглыбку. Устала сястра раненька і хутчэй да Зінкі. Расказала свой сон. А Зінка на тое: „А мне прыснілася, што мы з табою сядзелі ў акне і нам заспяваў певень. Мой бацька разгадаў, што мы з табою памрэм паненкамі, молада”. Дзяўчаты здорава напужаліся. Пабеглі расказаць цётцы Гандзі — мела соннік. Яна і рашыла: „Ты, Надзя, пойдзеш замуж за вайскоўца, а ты, Зінка, уляціш як у проглыбку — кепскі будзе твой замуж. А мужы вашы будуць з аднае вёскі!” Так яно і было ў жыцці!

Ноччу хлопцы высыпалі попелам сцежкі — ад дзяўчат да хлопцаў. Раніцай вярталіся людзі з царквы з усяночнай і ўглядаліся, да каго былі павысыпаныя сцежкі. Тэма была на ўсю зіму! А калі гаспадар не зачыніў клуні, на другі дзень плуг ці барану знаходзіў на чужой, у другім канцы вёскі. Спрабуй здымі!

Калі мне было амаль 16 гадоў, закахалася я ў хлопца. Быў ён стройны, чарнявы. Перад святамі кінула я тэхнікум (не любіла я яе, а яна мяне — матэматыкі!) і прыехала да бацькоў у вёску. На гагатуху была дома. Вечарам прыйшлі хлопцы — Валодзя, Грыша, Пецька — і чакалі моманту, каб мяне „зацягнуць” да нарачонага (і ён чакаў). Прасядзела я вечар на адным месцы. Не ўдалося ім! А цяпер, даражэнькія, шкадую — было б што ўспамінаць! Ідучы спаць, нацягнула я шаўковыя панчохі, каб прысніўся мне мой будучы муж. Ну, думаю, напэўна прыйдзе ў сне здымаць тыя панчохі мой нарачоны! А хто ж бы іншы? А тут, на табе: прысніўся стары кавалер Грыша! Ну, што ж, падумалася мне — замала я верыла ў варажбу, вядома, маладое пакаленне!

Ніна БРУЧКО

9 770546 196000

— На размову са мной прыходзіў чалавек з УБ і хваліў мяне за стойкасць. Прасіў ён, каб я перадаваў ім інфармацыю пра гаспадароў, якія не ўступілі ў калгас. Гэты чалавек казаў, што трэба перасеяць кулакоў, але я адмовіўся даносіць на аднасяльчан, — заяўляе Сяргей Пліс...

Сяргей Пліс з Шастакова

У Шастакове (зараз Чыжоўская гміна) ціск на калектывізацыю ў пачатку пяцідзесятых гадоў быў вялікі. Дзесяць гаспадароў, якія трымаліся яшчэ аднаасобнага гаспадарання, дайшлі да выраду, што ў адзіночку не справяцца з велізарнымі падаткамі і націскам з боку тагачасных улад. Рашыліся яны аб'яднацца ў змаганні за сваю зямлю. Дэлегацыя з двух чалавек паехала са скаргай на мясцовыя ўлады ажно ў Міністэрства сельскай гаспадаркі ў Варшаву.

Паводле ўказанняў з Варшавы нанова была перамерана зямля шастакоўскіх індывідуальных гаспадароў і знізіліся падаткі. Хаця самае лепшае поле надалей засталося ва ўладанні калгаснікаў, для некаторых гаспадароў былі дабаўлены надзелы зямлі, на якія было паменшанае іх поле ў час заснавання калгаса. Гэта дазволіла аднаасобнікам вытрымаць найгоршы перыяд, калі прапаганда і намаганні ўлад ішлі ў напрамку паўсюднай калектывізацыі. Пасля выезду ў Варшаву, Сяргея Пліса многа разоў выклікалі ў бяспеку на допыты. Некалькі разоў яго штрафавалі, але не змаглі зламаць. Пасля палітычнай адлігі, калгас у Шастакове быў ліквідаваны, а ягоныя палі былі размеркаваны сярод гаспадароў. Паказалі яны, што намнога лепш адчуваюць сябе на ўласным полі, у выніку чаго павялічыўся ўраджай і разгарнулася жывёлагадоўля.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Сяргей Пліс

Баяліся немцаў

Сяргей Пліс (1912 года нараджэння), які стаў галоўным героем шастакоўскага пратэсту, памятае паслядоўнасці бежанства.

— У бежанства падаліся амаль усе жыхары нашай вёскі. Дома асталіся жыць толькі пяць старэйшых сямействаў, якія пабаяліся далёкага падарожжа. Гаварылі нам, што немцы будуць калечыць жанчын і таму ўсе ўцякалі, як маглі, — кажа Сяргей Пліс. — Мой бацька, Кузьма, служыў у Мікалаеўскай царскай кавалерыі. Наша маці, Марта, адправілася ў бежанства толькі з дзядзькам Міхалам, мной і маім брацікам. Спачатку ехалі мы возам, але пасля разабралі яго, загрузілі ў вагон і паехалі на цягніку. Затрымаліся мы ў вялікім сяле Тамбоўскай вобласці, у якім было пад пяцьсот дамоў. Да рэвалюцыі жылося нам добра. Мясцовыя людзі прыхільна ставіліся да нас і нават прыносілі нам харчы. Здаралася, што падкідалі яду ноччу, каб мы не бачылі, хто нас успамагае.

Умовы жыцця намнога пагоршыліся пасля рэвалюцыі. Тады бежанцы сталі збірацца ехаць на Радзіму.

— Пазней даехаў да нас бацька. У войску здабыў ён ветэрынарскую адукацыю. За свае паслугі расійскім сялянам атрымліваў ён харчпрадукты, за якія перад выездам купілі мы кабылку. На возе, які мы давезлі ў Расію яшчэ з Шастакова, даехалі ажно ў Бабруйск. Укралі нам там каня і далей прыйшлося дабірацца на цягніку, — успамінае спадар Пліс.

Гаравалі пасля бежанства

Дамоў жыхары Шастакова дабіраліся найчасцей пасля жніва, але іх палі ляжалі аблогам.

— Добра, што ў сяле асталіся цэлымі дамы і гаспадарчыя будынкі. У нас было 12 гектараў запушчанага поля. Прыйшлося ісці ў заработкі, каб прыдбаць харчаванне. Сталі мы касіць траву і сушыць яе. За прададзенае сена купілі мы пасяўное зерне, — гаворыць спадар Сяргей. — З Расіі бацька прывёз дубальтоўку, за якую купілі мы карову, а за царскія рублі купілі мы кабылку. Калі мне было 12 гадоў, чыноўнікі выгналі бацьку ехаць за дровамі. Тата прастыў, а пасля памёр. Тады я мусіў цяжка працаваць на гаспадарцы.

Сяргей Пліс успамінае цяжкія ўмовы гаспадарання і жыцця ў міжваенны перыяд.

— Пры санацыі ўсё было ў магазінах, але ў нас не было грошай. Хадзілі мы ў гумавых пасталах. Гандлем займаліся жыды, якія стараліся трымаць цвёрдыя цэны на сельгаспрадукты. Людзі з нашага сяла прадавалі мала збожжа ці мяса, бо найчасцей выкарыстоўвалі іх на свае патрэбы, — тлумачыць Сяргей Пліс. — Нашы гаспадары ў міжваенны перыяд не карысталіся мінеральнымі ўгнаеннямі і таму на нашых палях расло мізэрнае збожжа. На агульным лузе пасвілі мы толькі па кароўцы і таму было мала малака.

У 1939 годзе Сяргей Пліс служыў у польскім войску. У верасні трапіў на вайну з немцамі. Пасля быў у палоне і многа там нацярпеўся. Пазней яго і іншых аднавяскоўцаў заставілі працаваць на патрэбы спачатку савецкай, а пазней і нямецкай дзяржаў. Пасля вайны мусіў вельмі многа працаваць, каб справіцца з падаткамі і харчпрадуктамі.

— Па вайне было ў нас пад 16 гектараў поля. Трэба было працаваць у лесе і аддаваць харчпрадукты на патрэбы дзяржавы, за якія мала плацілі, — успамінае Мікола Мароз.

Вялікія падаткі

Многа клопатаў чакала маіх суседзяў пасля заснавання ў Шастакове калгаса.

— У калгас уступілі ўсе бяднейшыя гаспадары, а як сталі абкладваць нас падаткамі, да калектыўнай гаспадаркі далучыліся таксама і багацейшыя, — кажа Сяргей Пліс.

Па-за калгасам асталося толькі 10 сем'яў з Шастакова і тады сталі павышаць ім падаткі.

— У мяне было 7 гектараў поля, але падаткі былі вельмі вялікімі. Высокія падаткі былі таксама ў іншых гаспадароў і павышаліся яны з кожным годам. Людзі апасаліся, што ў наступных гадах не збяруць грошай на налогі і будуць вымушаны ўступіць у калгас, — гаворыць спадар Сяргей. — Нам далі поле намнога горшае ад таго, якое забралі пад калгас. У адным месцы толькі вада стаяла. Пасля падалі мяне ў суд за тое, што я ездзіў па калгаснай траве на сваё поле. Раней была там дарога і па ёй я дабіраўся на сваю зямлю. Пакаралі мяне за праезд па гэтай дарозе на 3 тысячы злотых, што раўнялася цане каровы. Пазней я стаў дабірацца на сваё поле акружной дарогай праз участак сваяка.

Калгаснікам паставілі абору і свіран

— У аборы гадавалі кароў, а пазней свіней, — кажа спадар Пліс.

— Усе лепшыя землі ўключылі ў састаў калгаснага поля і спачатку ў калгаснікаў быў добры ўраджай. Пасля плён збожжа ў калгасе стаў меншым. Аднаасобнікі лічыліся ворагамі калгаса, — гаворыць Мікола Мароз. — Наша сям'я, хаця атрымала горшае поле ў напрамку Асоўкі, стала плаціць вельмі вялікія падаткі.

Рашыліся ўпамянуцца за сваё

Гаспадары, якія не ўступілі ў калгас, сталі задумвацца, як далей быць аднаасобнікамі. Рашыліся яны выслаць дэлегацыю ў Міністэрства сельскай гаспадаркі ў Варшаву, каб расказаць там пра падаткі, якія не пад сілу жыхарам Шастакова. Паехаць у сталіцу згадзіўся Сяргей Пліс, які ў 1939 годзе ваяваў у Варшаве і ведаў горад.

— Са мной у Варшаву паехаў іншы гаспадар. У нас быў ліст з паўнамоцтвамі выказвацца ад імя аднасяльчан. Заехалі мы ў Міністэрства сельскай гаспадаркі і сустрэліся там з міністрам Янам Домб-Коцёлам. Я сказаў міністру, што ў нас няма справядлівасці ні ў гміне, ні ў павеце, ні ў ваяводстве і прыехалі мы даведацца, ці ёсць справядлівасць у Міністэрстве сельскай гаспадаркі. Мы расказалі пра нашы клопаты і я паказаў міністру падаткавыя квітанцыі, паводле якіх было відаць, што ў мяне завялікія падаткі як на маю гаспадарку. Міністр Домб-Коцёл сказаў нам, што вышле ліст у Беласток інспектару сельскагаспадарчай службы, каб чыноўнікі на месцы ацанілі нашу скаргу, — расказвае Сяргей Пліс. — Пераначавалі мы ў сталіцы ў Валодзі Шварца, выхадца з нашага сяла, і вярнуліся дамоў.

— Пасля вяртання з Варшавы, прыехалі землямеры з Беластока, зрабілі ў нас сход і сказалі, што трэба перамерыць наша поле згодна з міністэрскімі ўказаннямі, — успамінае Мікола Мароз.

— Нам, аднаасобнікам, памералі зямлю і хаця не вярнулі нашага якаснага поля, налічылі падатак адпаведны арэалу зямлі. Хаця налогі надалей былі вялікімі, адчулі мы заўважальную палёгку.

Не прымусілі ўступіць у калгас

Пасля Варшавы Сяргея Пліса сталі выклікаць на допыты ў бяспеку.

— Абвінавачвалі мяне ў бунтаванні людзей супраць калгаса. Восем разоў вызывалі мяне на допыты, часта білі. Гаварылі, што я служыў пілсудчыкам у войску ў 1939 годзе, і таму не хачу ўступіць у калгас, — гаворыць растрывожаным голасам Сяргей Пліс. — Наймацней пабілі мяне за першым разам. Следчы запрапанаваў мне сесці на крэсла і ўдарыў у твар. Я тады вельмі знерваваўся і ўдарыў следчага. Адразу ўбеглі ў пакой яшчэ трох мужчын і мяне так пабілі, што жонка тыдзень часу пераварочвала мяне з боку на бок, бо я не мог сам перавярнуцца.

— Сяргея Пліса ў канцы судзілі. Прыдзіраліся да Сяргея і абвінавачвалі яго ў нагаварванні сялян супраць партыі і калгаса, — успамінае Мікола Мароз.

Пазней памянялі палітыку і прапанавалі Сяргею Плісу супрацоўнічаць з бяспекай.

— На размову са мной прыходзіў чалавек з УБ і хваліў мяне за стойкасць. Прасіў ён, каб я перадаваў ім інфармацыю пра гаспадароў, якія не ўступілі ў калгас. Гэты чалавек казаў, што трэба перасеяць кулакоў, але я адмовіўся даносіць на аднасяльчан, — заяўляе Сяргей Пліс.

Калі быў ліквідаваны шастакоўскі калгас, ціск на гаспадароў з боку ўлад спыніўся.

— У 1956 годзе разваліўся калгас і тады сталі нанова перамяраць наша поле і размяркоўваць яго сярод сялян.

Памалу сталі мы жыць лепш, пачалі прадаваць больш збожжа, сталі гадаваць больш кароў і свіней, — кажа спадар Пліс.

Аляксей МАРОЗ

Парады для ўсіх выязджаючых


http://www.nowiny.pl

http://www.nowiny.pl

Зусім нядаўна ў мае рукі папала кніжка Леаніда Пранчака пад загалоўкам „Беларуская Амерыка". Я пачала перагортваць старонкі і не заўважыла, калі мінула некалькі гадзін. Змест гэтай кнігі асабліва накіраваны на чытача, які цікавіцца тэмай беларускай эміграцыі ў Злучаных Штатах Амерыкі. Я адразу звярнула ўвагу на вялікую працу, якую трэба было ўкласці аўтару ў стварэнне, так абшырнай у сваіх размерах, кнігі. „Беларуская Амерыка" — гэта збор многіх інтэрв'ю з беларускімі дзеячамі, пісьменнікамі, паэтамі, артыстамі, якія ў неспрыяльныя часы апынуліся па-за межамі сваёй Айчыны. Аўтар, правёўшы нейкі час у ЗША, пазнаёміўся і асабіста размаўляў з многімі беларусамі, а калі яму не ўдалося з нейкай, цікавай для яго асобай паразмаўляць, ён вырашаў перапісвацца з ёю. Часта іхняя перапіска працягвалася многія гады. З перапіскі і размоваў з людзьмі, Леанід Пранчак адкрыў для сябе новую краіну — Замежную Беларусь. Краіну без візаў і межаў, краіну любові і смутку, над якой лунае беларускі дух, які дзесяцігоддзямі вынішчаўся на бацькаўшчыне. Яго зберагли, захавалі, яму маліліся беларускія эмігранты. Загалоўкі раздзелаў у кнізе з'яўляюцца вельмі характэрнымі, напрыклад, „Незалежнасць — найбольшая падзяка за нашу працу" (Кастусь Калоша), „На эміграцыі мы робім тое, што не маглі рабіць на бацькаўшчыне" (Вітаўт Кіпель), „Я верыў у Бога і Беларусь" (Святаслаў Коўш). Гэтыя загалоўкі з'яўляюцца цікавымі самі па сабе; словы суразмоўцаў Леаніда Пранчака адначасова заахвочваюць, каб прачытаць інтэрв'ю.

Аднак сёння я хацела звярнуць увагу чытача не на змест інтэрв'ю, а на дадатак, які Леанід Пранчак далучыў у канцы кнігі. Яго загаловак: „Мы, амерыканцы беларускага паходжання... Матэрыялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Амерыцы". У гэтым раздзеле знаходзяцца дакументы і публікацыі з перыёдыкі, якія дапаўняюць аповеды суразмоўцаў аўтара „Беларускай Амерыкі". Гэтыя матэрыялы мелі стаць для чытача кнігі прадметам роздуму, аналізу і вывучэння. Маю асаблівую ўвагу звярнула першая частка раздзела, пад загалоўкам „Рады для эмігрантоў, каторые едуць у Амэрыку". Я прачытала яе з увагай і вялікім зацікаўленнем, таму што раней у ніякай публікацыі я не сустрэлася з гэтай тэмай. Людзі выязджалі са сваёй Айчыны і здавалася, павінны даваць сабе рады, аднак аказалася, што ўжо на пачатку XX стагоддзя была прыдумана і выдадзена брашура на беларускай мове ў якасці дапаможніка для ўсіх беларусаў, якія эміграваллі ў Амерыку. Ужо ў 1912 годзе Таварыства апекі над эмігрантамі ў Вільні надрукавала спецыяльныя парады Язэпа Акаловіча для тых, хто ехаў у ЗША. Вось гэтыя парады:

Рады для эмігрантоў, каторые едуць у Амэрыку

Агульные рады і перэсьцярогі

«Хто маніцца ехаць за морэ, шукаючы заработку, або думаючы сесьці там на гаспадарку, павінен перш наперш добра падумаць, ці варта яму пакідаць свой родны край і шукаць шчасьця ў далёкай старонцы, сярод чужых людзей. Гэткая падарожа, гэта ешчэ важнейшы крок, чым выезд на заработак у каторы с чужых краёў Эўропы. Наражае яна на вялікі кошт і калі не ўдаецца, то няхват грошы змушае часам астацца на заўсёды ў чужой старонцы. Лягчэй распрадацца, або запазычыцца і паехаць „за морэ", чым вярнуцца адтуль здаровым і з заашчаджэнымі грашамі.

Ехаць за морэ не павінен ніхто з тых, хто мае ў сваёй старонцы кавалак зямлі або іншы які пэўны заработак. Не павінен так сама ў заморскую падарожу выбірацца і той, хто баіцца цяжкой працы і хацеў бы мець лёгкі кусок хлеба... Кожны грош, які там адкладаецца, купляецца толькі вялікай працай, хрэсьціцца крывавым потам.

Ня трэба верыць у гутаркі агентоў, каторые хваляць заморскія парадкі. Бо ўсе нагаворы з іхняе стараны — гэта іх заработак. Агенту тое не рупіць, якая доля спаткае эмігранта, а ўвесь клопат яго ў тым, каб намечэнаго чэлавека спакусіць да выезду на караблёх таго таварыства, с каторым ён у згаворы і каторае яму плаціць ад „галавы"...

...Адначэ не толькі нагаворы агентаў заахвочываюць да выезду за морэ нераз такіх людзей, каторые ў сваім уласным інтарэсе лепей бы зрабілі астаючыся ў родным краю.

Не малую маюць тут вагу расказы „бывальцоў" і „заморскія пісьмы".

Кожнаму, хто наважыўся паехаць за морэ, самі сабой навязываюцца гэткіе тры пытаньня:

1. Куды ехаць?
2. Калі ехаць?
3. Якой дарогай даехаць?

Выезд за морэ, гэта рызыка для кожнаго, найменьш-жэ рызыкуюць тые, што едуць да сваіх сваякоў, родзічоў або сяброў, сьпісаўшыся з імі і маючы акуратные іхніе адрасы.

http://www.statua.prv.pl/

У іншых прыпадках можна толькі агульна сказаць, што для эмігрантоў, каторые патрапяць цяжка працаваць рукамі, маюць многа сілы і здароўя і каторыя хочуць па нейкім часе вярнуцца дамоў, найлепей падходзяць цяпер Злучэныя Штаты Паўночнай Амэрыкі.

Для тых-жэ, каторыя пастановілі перэсяліцца, каб сесьці на зямлю, як каланісты, найбольш прыгодные варункі мае правінцыя бразылійская Парана, або штат Віцконсін у Паўночнай Амэрыцы.

Восеньню можна ехаць у Аргентыну на жніўныя заработкі, каторые там бываюць з дзекабра да апрэля.

Найцяжэй знайсьці работу ў глаўным партовым месьце Новым Ёрку і хто выбіраецца ў тую старану, павінен мець у запасе грошы, на далейшую дарогу ў глыб старонкі.

Ніколі не павінен ніводзін эмігрант выежджаць у тые старонкі, у каторых шырэйшаго эміграцкаго руху ніколі не бывало, як напрыклад да Азіі, Афрыкі, Гонолюлю і на іншыя астравы, бо ў такой старане, пасярод саўсім чужых людзей, не маючы жывой душы жычлівай, да каторай мог-бы, як да свайго, звярнуцца ў большай якой бядзе, чэлавек марна згіне. Хто даўся ўгаварыць сябе да гэтаго нейкаму агенту, або апісанню якой кніжкі, той ашалеў хіба, бо прыгаварвае сябе на блізка што пэўную няволю, або на смерць ад благога паветра ці непасільных варункаў працы і безміласэрнаго здзірства.

...Хто ўжо купіў білеты на параход і дастаў паведамленьне і для выезду, павінен вельмі пільнавацца, каб не спазьніцца на параход і не наразіцца на вялікіе страты. Лепей зробіць выежджаючы са сваёй вёскі на які дзень раней, чым на гадзіну запозна.

Эмігрантоў эўропейскіх перавозяць за морэ караблі з розных портаў: Лібава ў Расеі, Гамбург і Брэма ў Нямеччыне, Антвэрпія ў Бэльгіі, Роттэрдам у Голляндыі.

Падарожа на караблі III класам заўсёды бывае непрыятнай.

Шмат хто атрымлівае карабельныя білеты ад сваіх сваякоў, або знаёмых з Амэрыкі (так званыя па англіцку prepaids)...

Рыхтаваньне ў дарогу

Выезд і дарога

Хто акуратна ўсё абдумаўшы наважыўся выехаць за морэ, павінен перш за ўсё (перш яшчэ чым купіць білет на праезд на караблі) пайсці да

доктара, каб агледзеў ці ня хворы ён:

1. на трахому (егіпецкае запаленьне вачэй);
2. на калтун;
3. скурную высыпку;
4. падучую хваробу;
5. на ўсыханьне мускулоў.

Калі пачуваецца саўсім здаровым і не мае зачырванеўшых вачэй, можа пайсці да доктара толькі ў тым месьце, у каторым купляе параходны білет, калі гэтае место не заграніцай.

Бо хворых на вышэй апісаныя хваробы ў Амэрыку (асобліва Паўночную) не пускаюць, а часам і не пазваляюць ім і садзіцца на карабель.

Пасьля трэба падумаць аб пашпарце таму, хто яго яшчэ не мае. Для кабет годзі абы якой казённай паперы (напрыклад, мэтрыка хсьцін або шлюбу, работніцкая кніжка і т.п.).

Шмат хто з эмігрантоў не выбіраюць сабе загранічных пашпартоў, а карыстаюць перамытчыкамі і пераходзяць граніцу тайком, абы толькі перэшварцавацца.

Аблічаючы грошы патрэбные на дарогу, трэба памятаць аб тым, што выседаючы на бераг у Паўночнай Амэрыцы кожны павінен мець гатовымі грашмі пры сабе найменш 25 даляроў (50 рублёў) апрача платы за білет чугункай у тое место, куды ён едзе. Хто не мае пры сабе гэтулькі грошы, — таму ў Амэрыцы не пазволяць высесьць на берэг.

Хто едзе ў Амэрыку на заработкі, думаючы вярнуцца, той не павінен браць вялікіх скрынак. У скрынячку трэба браць толькі найбольш патрэбные рэчы — глаўным чынам адзежу і бялізну. Скрыначка павінна зачыняцца на замок, каб не абакралі ў дарозі.

Харчоў на запас у дарогу не варта браць больш, як на двое сутак, пакуль едзецца чыгункай да партоваго места, бо на караблі даюць усе харчы, за іх плоціцца разам з білетам.

Перад выездам у Амэрыку добра кожны зробіць, калі ўпарадкуе ўсе інтарэсы свае асабістые і наменьне сваё...

У часе пераезду чыгункай трэба быць цьвярозым, не расказываць кожнаму першаму лепшаму куды і зачым едзеш, не паказываць нікому, якіе маеш грошы або дакументы. Калі трэба чаго даведацца ў дарозі, лепей за ўсё пытацца кандуктароў або тых служачых, што ў мундзерах.

У часе падарожы морэм трэба акуратна пільнавацца карабельных парадкоў, ня піць лішне спіртных напіткоў, высьцерэгацца ўсякіх сварак і спорак с таварышамі падарожы або службай карабельнай.

На ўсіх лепшых караблёх ёсць каюты з лазьнямі і ваннамі.

Большые грошы лепей за ўсё аддаваць на сховы капітану карабля ў запечатаным канверці.

У канцы, хто ўмее чытаць, заместа маркоціцца цэлымі днямі і пазіхаць, ніхай лепей выўчыцца мовы таго краю, у каторы едзе...

Прыезд у Амэрыку. Першые крокі

Кожны эмігрант, которы прыежджае ў Паўночную Амэрыку, пакуль дастане пазваленьне высесьць на берэг, павінен прайсьці розныя фармальнасьці.

Бывае так, што іміграцыйные чыноўнікі кіруюцца не амэрыканскімі законамі, а проста сваім здумам і з гэтай прычыны часам так здараецца, што не пускаюць на берэг нават зусім годнаго эмігранта.

Дзеля гэтаго змігрант ніколі ня можэ мець пэўнасьці, што паехаўшы ў Амэрыку, ня вернецца назад, страціўшы шмат часу і грошы на дарогу...

Для ўкраінцаў, як у нас кажуць хахлоў, ёсьць у Ноў Іорку „Рускы народны дом", дзе рэдакцыя газеты „Русскы голос". Там мову нашу добра разумеюць.

Для каталікоў усіх нацый, у тым ліку ўкраінцаў і беларусоў ёсць у Балціморэт „Каталіцкі эміграцкі дом".

...Ніколі эмігрант не павінен падпісываць кантракту, напісаную толькі ў англіцкай мове, пакуль нехто, каму саўсім можна верыць, не перакладзе на мову».

(З брашуры „Рады для эмігрантоў, каторые едуць у Амэрыку, а такжэ размовы беларуска-англіцкіе". Павэдле Язэпа Околовіча. Выданьне Таварыства апекі над эмігрантамі. Вільня, 1912)[1].

Брашура была выдадзена ў часе, калі беларуская эміграцыя набывала масавы характар. Галоўная і найбольшая хваля тагачаснай эміграцыі прыпадала на 1905-1913 гг. Эмігранты найчасцей выбіралі краіны Паўночнай Амерыкі — Злучаныя Штаты Амерыкі і Канаду, ахвотна кіраваліся таксама ў краіны Паўднёвай Амерыкі — Бразілію і Аргенціну. Па сённяшні дзень Злучаныя Штаты Амерыкі з'яўляюцца галоўным цэнтрам беларускай эміграцыі.

Шмат людзей з многіх краін надалей выязджае са сваёй радзімы ў невядомае па розных прычынах — у пошуках шчасця, лепшай будучыні, грошай, цікавейшага жыцця, па палітычных матывах. У выпадку многіх гэта часовы выезд на заработкі — самая частая ў сённяшні час форма эміграцыі. Такі род эміграцыі вельмі папулярны ў апошнім часе сярод жыхароў Польшчы, якія часцей за ўсё, выязджаюць у ЗША, Вялікабрытанію ці Ірландыю. Цяпер намнога радзей, чым калісьці, людзі выязджаюць назаўсёды.

Ад выдання брашуры мінула шмат часу, аднак многія парады з'яўляюцца актуальнымі па сённяшні дзень, хаця сучасны свет намнога іншы, шмат у ім змянілася ад моманту выдання брашуры. Аднак таксама сёння вельмі заахвочваю ўсіх, хто выбіраецца ў дарогу, неабавязкова ў далёкую Амерыку, прачытаць парады і глыбока задумацца над імі.

Анна ДЭМЯНЮК

[1] *Л. Пранчак,* Беларуская Амерыка, *Мінск 1994, стар. 359-364.*

ПРЫ САВЕТАХ І НЕМЦАХ

Пра мінулае расказвае 81-гадовая Анна Янушык, жыхарка Рэпчычаў, што ў Кляшчэлеўскай гміне.

З прыходам саветаў у 1939 годзе ва ўрочышчы „Верасок" рускія збудавалі ваенны гарадок. Я тады была дзяўчом і жыла пры бацьках у Кузаве. Салдаты жылі ў зямлянках. Афіцэры кватараваліся ў гаспадароў. У нашага бацькі, Баўтрамея Рэпкі, жыў старшы лейтэнант Маёраў, а ў Марыі Саласцюк — падпалкоўнік Аўсяннікаў, камандзір. Кантора падпалкоўніка Аўсяннікава змяшчалася ў першай зямлянцы, а ў другой была тайная канцылярыя. Шмат скрыняў было ў ёй. Вартаўнікі кругласутачна трымалі там варту. Я працавала прыбіральшчыцай. Калі я прыбірала канцылярыю, вартаўнік на крок мяне не адступаў: куды я, туды і ён ішоў, ніякай паперкі не дазваляў вынесці. У ваенны гарадок можна было хадзіць і кінафільмы глядзець. Пачаткова ўступ быў свабодны, але пасля цывільным забаранілі прыходзіць. Паколькі я лічылася іхнім работнікам, дык мне не забаранялі.

Анна Янушык

У сорак першым годзе, як пачалася вайна, рускія кінуліся наўцёкі, хто куды. Скрыні з канцылярыі пагрузілі на аўтамабіль і павезлі ў Чаромху, затым чыгуначным транспартам адправілі ў напрамку Ваўкавыска. Афіцэры падаліся ў сваю часць, а жонкі засталіся. У нашага кватаранта была швейная машына. Калі ён уцякаў, дык прыхапіў яе з сабою, толькі стол ад машыны застаўся. Старшы лейтэнант Маёраў адно крыкнуў нашаму бацьку на хаду: „А скажите полковнику Овсянникову пусть стол с собой прихватит". А камандзір на гэта: „Да чёрт побери с этим столом. Забрось его в ямку пусть лежит". У Мікалая Калістратавага на кватэры засталася камандзірша. Неўзабаве і яна падалася ў Саюз. Пасля вайны прыслала ліст, але не ведаю, што ў ім пісала. З прыходам немцаў мяне забралі на прымусовыя работы ва Усходнюю Прусію. Больш трох гадоў я працавала на гаспадарцы ў Старых Юхах. Гаспадара клікалі Аўгуст Хляпка. У яго было чатыры сыны і дзве дачкі. Усе яны былі на фронце. Самы малодшы добраахвотна падаўся ў армію.

Пачаткова прызначылі мне памяшканне ў неабагаванай кладоўцы. На зіму гаспадыня дала мне пярыну. Калі я лягала спаць, дык хавалася з галавою пад яе. Пасля прыспасобілі мне ложак у кухні. У зімовы час я даглядала жывёлу — дваццаць кароў, шэсць коней ды вялікі статак гусей і качак. Пасля ранняга кармлення ішла я з гаспадарамі ў стадолу малаціць збожжа. Летам я палола буракі. Кароў даіла з гаспадыняю. Малако пастаўлялі на скупку, узамен давалі картачкі. Норма адна на ўсіх была, што на немца, тое ж і на работніка. Але некаторыя гаспадары сваім работнікам картачак не давалі, толькі сабе бралі. Пан Хляпка меў назначаную норму на муку. Гаспадыня сама хлеб пякла. Найгорш прыходзілася зімою, калі трэба было рабіць сцірку. Гэтай было хоць адбаўляй. Бялізну мылі ўручную, паласкалі ў проламцы возера, затым неслі дахаты. На рычагах развешвалі ды сушылі. З падыходам фронту ўсіх выганялі на захад. Гаспадарам паступіла вестка, што іх сын загінуў пад Масквою. Другі, паранены, наведаў бацькоў. Памятаю як па-мазурску гаварыў: „Gdzie walczyły ruskie baby, tam mocno biją". Як рушыў фронт, пан Хляпка з дачкою ўцякаў з намі. У час падарожжа нашы дарогі разышліся. Цяжка тады нам прыходзілася. Хаваліся мы ў лесе і па стадолах, цярпелі голад, вошы напалі.

20 сакавіка 1945 г. рускія занялі тэрыторыю, дзе мы знаходзіліся з іншымі ўцекачамі. Размеркавалі нас па пунктах, раздзялялі паводле нацыі. Я падалася беларускай. Усіх беларусаў прызначылі да дапаможнай гаспадаркі і мы засталіся на тылах фронту. Кватараваліся ў вялікім будынку апусцелага маёнтка. Салдаты даглядалі коней і хадзілі на заняткі, а мы на работу ў поле, садзілі бульбу і капусту, сеялі авёс для коней на корм. Найгорш я баялася, калі праходзіў фронт. Стральба навокал, снарады рвуцца, а рускія ўсё „вперёд" і „вперёд". У дапаможнай гаспадарцы прабывала я ад сакавіка да ліпеня, як жніво пачыналася. Пасля дамоў вярнулася.

Пасля вайны, калі спатрэбіліся дакументы, я адшукала сваіх гаспадароў. Найстарэйшы, 90-гадовы сын гаспадароў жыў і ён мне даслаў адрас сястры. Муж яе быў уладальнікам гарбарні. Ад іх я атрымала пасведчанне.

Тэкст і фота
Уладзіміра СІДАРУКА